БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
юрыдычны факультэт
кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

**Т. І. ДОЎНАР**

# ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
(першая частка )
для студэнтаў 1 курса юрыдычнага факультэта
аддзялення правазнаўства

Мінск 2002

Падрыхтаваны доктарам юрыдычных навук, прафесарам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта
Доўнар Таісіяй Іванаўнай

Рецензенты:
Рэшэтнікаў С.В. – дырэктар Інстытута дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Презідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук, прафеса;
Слабодчыкаў А.А. – Інстытут сучасных ведаў, кандыдат юрыдычных навук, прафесар.

Зацверджаны на пасяджэнні кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (пратакол № 4 ад 29 студзеня 2002 г.)

Рэкамедаваны да выдання Вучоным Саветам юрыдычнага факультэта 29 студзеня 2002 г. (пратакол № 5)

# ПРАДМОВА

Вучэбна-метадычнае выданне па гісторыі дзяржавы і права Беларусі прызначана ў першую чаргу для студэнтаў - першакурснікаў, якія з дапамогай змешчаных у ім матэрыялаў (метадычных указанняў па падрыхтоўцы да лекцый і семінарскіх заняткаў, па напісанню курсавых прац; пераліку асноўных пытанняў, на якія патрэбна звярнуць увагу; спісу літаратурных крыніц; тэматыцы курсавых і навуковых прац і інш.) змогуць належным чынам вывучыць прадмет і падрыхтавацца да экзамена, а затым у наступным - паспяховага авалодаць спецыяльнымі юрыдычнымі дысціплінамі – канстытуцыйным, грамадзянскім, крымінальным, працэсуальным правам і інш.

Гэтая кніга будзе таксама карыснай і студэнтам-завочнікам.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі, якая вывучае прычыны і заканамернасці ўзнікнення, станаўлення і развіцця на тэрыторыі нашай краіны дзяржавы і права, іх асаблівасці і характэрныя рысы, дазваляе глыбей асэнсаваць асаблівасці сучаснай дзяржаўнасці і яе прызначэнне. Для таго, каб прагназіраваць далейшае развіццё усей чалавечай супольнасці, у тым ліку і беларускай дзяржаўнасці неабходна вывучыць, прааналізаваць і асэнсаваць прычыны ўзнікнення і паэтапнае развіццё ўсіх, без выключэння дзяржаўнасцей, выявіць заканамернасці і тэндэнцыі гістарычнага працэсу, звярнуць увагу на асаблівасці ў развіцці канкрэтных дзяржаў і дзяржаўна-прававых інстытутаў.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі з'яўляецца адной з фундаментальных юрыдычных дысціплін, якая мае мэтай фарміраванне ў студэнтаў прававога мыслення, павышэнне ўзроўня прававой культуры і прызначана даць студэнту яснае і глыбокае разуменне заканамернасцей гістарычнага працэсу ўзнікнення і развіцця дзяржаўнасці і права, змены тыпаў і формаў дзяржаўнасці, эвалюцыі дзяржаўных органаў і прававых інстытутаў і г.д. Яна з'яўляецца гістарычнай навукай і ўяўляе сабой частку гісторыі чалавецтва, а таксама юрыдычнай навукай – адной з фундаментальных прававых дысціплін.

Як адна з гісторыка-прававых дысцыплін, гісторыя дзяржавы і права Беларусі мае не толькі пазнаваўчае, але метадычнае і практычнае значэнне, бо дапамагае выпрацаваць у студэнтаў погляд на дзяржаву і права як на дынамічны арганізм, які пастаянна

развіваецца ў цеснай узаемасувязі з рэальным грамадска-палітычным становішчам, а таксама садзейнічае набыццю студэнтамі навыкаў абагульнення канкрэтна-гістарычнага матэрыялу, умення аналізаваць гэты матэрыял і фармуляваць навуковыя вывады. Гістарычны аналіз заканадаўства неабходны для правільнага разумення і ўсведамлення дзеючых законаў і крытычнай ацэнкі застарэлага нарматыўна-прававога матэрыялу.

Аналіз гістарычнага вопыту юрыспрудэнцыі Беларусі непасрэдна ўплывае на фарміраванне навуковага светапогляду, дапамагае ўсведамленню поспехаў і памылак у гісторыі грамадска-палітычнага жыцця людзей, іх аб’ектыўнаму аналізу.

Пры вывучэнні прадмета трэба мець на ўвазе, што некаторые праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі застаюцца яшчэ недастаткова даследаванымі, а шэраг з іх разглядаецца з некалькіх, часам супярэчлівых, пунктаў гледжання.

Метадычныя рэкамендацыі маюць мэтай дапамагчы студэнтам паспяхова авалодаць не толькі праграмным матэрыялам па курсу гісторыі дзяржавы і права Беларусі, але і навыкамі даследчай, творчай дзейнасці, выпрацаваць неабходныя метадычныя прыёмы падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў, экзаменаў, напісання кантрольных і курсавых прац.

У адпаведнасці з асноўнай задачай універсітэтскай адукацыі - падрыхтоўкай маладых спецыялістаў да самастойнай творчай працы, студэнты з дапамогай выкладчыкаў на падставе розных формаў самастойнай працы набываюць і ўдасканальваюць навыкі авалодання пэўнай метадалогіяй, прыёмамі падбору, выкарыстання, сістэматызацыі нарматыўна-прававога, літаратурнага, статыстычна-дакументальнага матэрыялу. Яны авалодваюць уменнем правільна выбіраць неабходную літаратуру і аналізаваць яго, рабіць абагульненні і адпаведныя вывады, што садзейнічае паступоваму фарміраванню навуковага мыслення, развівае ў студэнтаў здольнасць да навуковай творчасці. Вынікам гэтага будзе не толькі паспяховае авалодванне прадметам, але і фарміраванне ўласнага погляду на праблемныя і спрэчныя пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, развіцце іх творчай актыўнасці, ініцыятывы і самастойнасці, што у рэшце рэшт з'яўляецца адным з фактараў эфектыўнасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў у галіне правазнаўства.

Для таго, каб студэнт не разгубіўся ў вялікай колькасці гісторыка-прававога матэрыяла прадугледжана пэўная праграма

курса, якая зацвярджаецца кафедрай. У адпаведнасці з ёй распрацоўваецца рабочая праграма, тэматычны план лекцый і семінарскіх заняткаў, а таксама планы семінарскіх заняткаў з вызначэннем канкрэтных пытанняў (як правіла, найбольш важных і праблемных) і асноўных літаратурных крыніц.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
## лекцый і семінарскіх заняткаў

па курсу “Гісторыя дзяржавы і права Беларусі”
для студэнтаў 1 курса юрыдычнага факультэта (вочная форма навучання)
па спецыяльнасці Г 09-01-00 “Правазнаўства”

| № | Назва тэмы | Лекцыі | Семінары | КСР |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грамадска – палітычны лад і права на Беларусі ў IX – XII ст. | 4 | 4 | |
| 2 | Дзяржаўна – палітычны і грамадскі лад на Беларусі ў XIV – XVI ст.ст. Уніі Вялікага княства Літоўскага с Польшай. | 8 | 6 | |
| 3 | Судовая сістэма Вялікага княства Літоўскага. Судаводства. | 4 | 2 | |
| 4 | Крыніцы беларускага феадальнага права. Развіццё права ў XV – XVI ст. ст. | 8 | 6 | 2 |
| 5 | Грамадска – палітычны лад і права Беларусі ў складе рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Рассіі. | 4 | 2 | |
| 6 | Грамадска – палітычны лад і права на Беларусі ў складзе Расійскай імперыі | | 2 | 2 |
| 7 | Рэвалюцыйныя перамены і змаганне за адраджэнне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці (1917 –1920 г.г.) | 6 | 6 | 2 |
| 8 | Дзяржава і права Беларускай ССР у міжваенны час (1920 –1940 г.г.) | 4 | 4 | |
| 9 | Дзяржава і права Беларускай ССР у перыяд другой сусветнай вайны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі с Беларускай ССР. | 2 | 4 | |
| 10 | Дзяржава і права Беларускай ССР у пасляваенны перыяд | 2 | 2 | |
| 11 | Дзяржава і права Беларускай ССР у перыяд застою і крызісу адміністрацыйна – каманднай сістэмы. | 2 | | 2 |
| 12 | Дзяржава і права Беларусі ў перыяд кардынальных рэформ і пераходу да | | 2 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | дзяржаўнай самастойнасці. | | | |
| 13 | Дзяржаўнае будаўніцтва Рэспублікі Беларусь. | | 2 | 2 |
| | Усяго | 44 | 42 | 12 |

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ЛЕКЦЫЙ

Важнейшымі сродкамі асваення дысцыпліны з'яўляецца самастойная праца студэнтаў, якая павінна насіць сістэматычны характар і мець разнастайныя формы, у тым ліку: падрыхтоўка да лекцый, семінарскіх заняткаў і экзаменаў шляхам вывучэння асноўнай і дапаўняльнай літаратуры, аналіза зместа нарматыўна-прававога матэрыялу; падрыхтоўка рэфератаў; напісанне кантрольных работ; удзел у працы студэнцкіх навуковых гурткоў; падрыхтоўка навуковых прац і удзел ў студэнцкіх навуковых канферэнцыях і інш.

Лекцыі накіроўваюць студэнта на шляху найбольш поўнага, хуткага і паспяховага вывучэння прадмета, стымулююць жаданне студэнтаў да глыбокіх ведаў і самастойнага асэнсавання гістарычных падзей, з'яў адносна ўзнікнення, станаўлення і развіцця дзяржаўнасці і права на Беларусі. Тэматыка і змест лекцый адпавядаць вучэбным праграмам, зацверджаным кафедрай і будуюцца на тэарэтычных прынцыпах адпаведнай навукі і аб'ектыўных заканамернасцях развіцця дзяржаўных і прававых з'яў і інстытутаў.

Пераход да шматступенчатай формы навучання з мэтай падрыхтоўкі бакалаўраў, спецыялістаў і магістраў абумовіў і перагляд формаў навучання. Асаблівая ўвага зараз надаецца галоўным чынам самастойнай працы студэнтаў, таму лекцый няшмат. У сувязі з гэтым студэнты павінны ў першую чаргу азнаёміцца з тэматычным планам лекцый, а таксама планам семінарскіх заняткаў і колам тых пытанняў, якія выносяцца на семінарскія заняткі і экзамены. Пасля гэтага яны павінны рыхтавацца не толькі да семінарскіх заняткаў, але і да лекцый: знаёміцца па падручніках, навучальных дапаможніках з тымі пытаннямі, якія будуць разглядацца на лекцыях.

Лекцыі з'яўляюцца тэарэтычнай падставай для самастойной працы, для падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў. Яны чытаюцца па важнейшых тэмах і маюць мэтай заахвоціць студэнтаў да самастойнай працы па поўнаму і ўсебаковаму засваенню курса.

Як правіла, на першай лекцыі, якая з'яўляецца ўводнай, выкладчык дае студэнтам пэўныя метадычныя рэкамендацыі па лепшаму засваенню матэрыяла, знаёміць з тымі патрабаваннямі, якія будуць прад'яўляцца на семінарскіх занятках і экзаменах, а таксама дае кароткі агляд важнейшых літаратурных крыніц (перш за ўсе падручнікаў і навучальных дапаможнікаў). Выкладчык стараецца даць сістэматызаваныя веды па прадмету, заахвоціць студэнтаў да дыялогу,

аднак спецыфіка сучаснага навучання патрабуе, як правіла, кароткага і тэзіснага выкладання матэрыялу са спасылкамі на выкарыстанне адпаведнай асноўнай і дапаўняльнай літаратуры. Самыя важныя і праблемныя пытанні разглядаюцца больш падрабязна, падвяргаюцца тэарэтычнаму аналізу і тлумачэнням выкладчыка. Звяртаецца ўвага на выпрацоўку студэнтамі самастойнага пункта гледжання па праблемных пытаннях на падставе супастаўляльнага аналізу дакументальна-прававога матэрыялу і вывучэння самых новых літаратурных крыніц.

Як правіла, у лекцыі не ставіцца мэтай ахапіць усе пытанні той ці іншай тэмы і ўсебакова іх асвятліць. Галоўная ўвага надаецца важнейшым і праблемным пытанням. Выкладчык перш за ўсе звяртае ўвагу на самыя вострыя дыскусійныя праблемы. Пры неабходнасці ён адсылае студэнтаў да той ці іншай манаграфіі, збораў дакументаў і помнікаў права.

# СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ

Планы семінарскіх заняткаў складаюцца ў адпаведнасці з праграмай курса гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Яны уключаюць найбольш важныя пытанні. Да плана дадаецца пэўны спіс літаратуры (крыніцы права, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, манаграфіі, навуковыя артыкулы і інш.). Аднак трэба мець на ўвазе, што літаратуру перш за ўсё трэба глядзець у праграме дысцыпліны, а таксама выкарыстоўваць навейшую літаратуру, якая ўвесь час папаўняецца.

Асноўнай мэтай семінарскіх занятка? з’я?ляецца заахвочванне студэнтаў да самастойнай працы і дапамога ім ў арганізацыі самастойнай працы па ўсваенню дысціпліны, а таксама замацаванне і праверка веда?, атрыманых на лекцыях і шляхам самастойнай падрыхто?кі і набыццё новых ведаў шляхам абмена думкамі і меркаваннямі з іншымі студэнтамі і падвядзення выкладчыкам вынікаў дыскусій.

На занятках паглыблена вывучаюцца наібольш важныя і складаныя прытанні і праблемы, канкрэтызуюцца асобныя палажэнні лекцыйнага матэрыялу, робяцца пэўныя вывады адносна развіцця дзяржавы і права ў той ці іншы гістарычны адрэзак часу. У гістарычны-параўнальным аспекце разглядаюцца сацыяльныя структуры грамадства, гістарычныя формы дзяржаў, арганізацыя і дзейнасць дзяржаўнага апарата (цэнтральных і мясцовых органаў улады і кіравання), функцыяніраванне судовай сістэмы, роля тых ці іншых гістарычных падзей у развіцці дзяржаўных і прававых інстытутаў, эфектыўнасць прававой сістэмы і інш. Акрамя таго, студэнты знаёмяцца з гісторыяй развіцця юрыдычнай тэрміналогіі. У выніку гэтага паступова выпрацоўваюцца і ўдасканальваюцца навыкі аналіза і тлумачэння нарматыўных актаў (помнікаў права), дакументальных крыніц, літаратурнага матэрыялу і такім чынам выпрацоўваецца юрыдычнае мысленне.

З той мэтай, каб семінарскія заняткі прынеслі карысць і студэнты спасціглі сутнасць абмяркоўваемай праблемы, яны павінны належным чынам рыхтавацца да іх правядзення. Непасрэдную падрыхтоўку да заняткаў трэба пачынаць з вывучэння лекцыйнага, а затым вучэбнага матэрыяла па адпаведнай тэме (у першую чаргу

падручнікаў і навучальных дапаможнікаў). Абавязковым з'яўляецца вывучэнне ўсёй рэкамендаванай па тэме літаратуры. Акрамя таго, студэнт самастойна шукае і вывучае неабходны дапаўняльны матэрыял у перыядычных выданнях: газетах, часопісах («Веснік БДУ», «Судовы веснік», «Беларускі гістарычны часопіс», «Юрыст» і г.д.) Патрэбна карыстацца таксама матэрыяламі навуковых канферэнцый прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ (іншых навучальных устано?), надрукаванымі ў адпаведных зборніках.

У сувязі з тым, што галоўнымі аб'ектамі даследавання гісторыі дзяржавы і права з'яўляюцца нарматыўна-прававыя акты ў іх гістарычным развіцці і што крыніцы права (граматы, судзебнікі, статуты, канстытуцыі, кодэксы і г.д.) з'яўляюцца самым адмысловым матэрыялам для вывучэння дзяржаўнага ладу, становішча насельніцтва, узроўня развіцця права (у тым ліку і працэсу развіцця юрыдычнага тэрміналагічнага апарата), студэнты павінны самастойна азнаёміцца з рэкамендаванымі да вучэння помнікамі права Беларусі.

Пры вывучэнні помнікаў права неабходна звяртаць увагу на гістарычныя ўмовы стварэння і прыняцця дакумента, яго прынцыпы, асноўную накіраванасць, структуру размяшчэння прававога матэрыялу, узровень юрыдычнай тэхнікі (паняційны апарат, тэрміналогію). На семінарскіх занятках студэнты аналізуюць змест канкрэтных гістарычных дакументаў (асабліва нарматыўна-прававых актаў), звяртаюць увагу на правапрымяняльную дзейнасць, у тым ліку на судовыя пастановы Асаблівая ўвага надаецца гістарычнаму развіццю канстытуцыйнага, грамадзянскага, крымінальнага, прыродаахоўчага і працэсуальнага права, пры чым яно абавязкова параўноўваецца з сучасным заканадаўствам.

Семінарскія (практычныя) заняткі павінны насіць творчы характар, таму і выкладчык самастойна выбірае форму іх правядзення.

У адпаведнасці з выпрацаванымі практыкай формамі семінарскіх занятка? праводзяцца, як правіла, дыспуты або апытанне студэнта? па пэ?ных тэмах з высвятленнем розных думак і меркавання? па праблемных пытаннях, або абмярко?ваюцца загадзя падрыхтаваныя студэнтамі даклады ці праводзяцца кантрольныя работы і інш.

Пры правядзенні семінарскіх занятка? важным з’я?ляецца ?дзел у дыскусіях (запланаваных і стыхійных) як мага большай колькасці студэнта?. Аналіз даклада? і выказвання?, крытычныя за?вагі павінны перш за ?се рабіць самі студэнты. Выкладчык накіро?вае дыспут у

неабходнае русла. Адказы на ?знікшыя пытанні і спрэчныя моманты павінны шукаць самі студэнты. Толькі ? выпадку, калі ?се студэнты, якія пажадалі выказацца па тых ці іншых пытаннях або праблеме, не знайшлі правільнага адказу на ?знікшыя пытанні, выкладчык завяршае дыспут і дае тлумачэнне. Семінарскія (практычныя) заняткі не толькі даюць ?я?ленне аб узро?ні самастойнай падрыхто?кі студэнта?, але прывучаюць іх да публічных выступлення?, навуковага аналізу, карэктнага і правільнага вядзення навуковай дыскусіі.

На семінарах выкладчык робіць запісы аб наведванні студэнтамі занятка? і іх акты?насці пры абмеркаванні вынесеных на семінарскія заняткі пытання?. Вынікі працы студэнта на семінарскіх занятках з'яўляюцца адной з падстаў для атрымання на экзаменах той ці іншай адзнакі.

## П Л А Н Ы
## семінарскіх заняткаў
## па гісторыі дзяржавы і права Беларусі

для студэнтаў юрыдычнага факультэта (аддзяленне правазнаўства) – 42 гадзіны

### ТЭМА 1
### ГРАМАДСКА – ПАЛІТЫЧНЫ ЛАД І ПРАВА БЕЛАРУСІ Ў IX-XII ст.ст.

**Заняткі 1**

1. Прадмет, асаблівасці, задачы навукі гісторыі дзяржавы і права.
2. Аб паходжанні назвы "Беларусь".
3. Гісторыяграфія гісторыі дзяржавы і права Беларусі:

а) ранняга феадалізму: (летапісы, хронікі)

б) XVI - XVIII стагоддзяў: (Ф. Скарыны, С. Будны, А. Волан, А. Алізароўскі і інш.)

в) XIX – пачатак XX ст. ст.: (Т. Чацкі, І. Даніловіч, М. Уладзімірскі – Буданаў, М. Любаўскі, І. Лаппо, М.Любаўскі і інш.)

г) савецкая гісторыяграфія: (У. Ігнатоўскі, М. Доўнар – Запольскі, В. Пічэта, С. Маргунскі, В. Круталевіч, Т. Доўнар, В. Шаўкапляс, А. Вішнеўскі, С. Сокал, Я. Юхо і інш.)

**Заняткі 2**

Усталяванне дзяржаўнасці на Беларусі.

Старажытныя дзяржавы – княствы на Беларусі (Полацкае, Тураўскае і іншыя). Іх грамадскі і палітычны лад.

Асноўныя рысы звычаёвага права Беларусі.

Старажытнае дагаворнае права (дагаворы 1229, 1263. 1323, 1341 гг. і інш.)

Васальныя дагаворы.

### Літаратура да тэмы 1

Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. даведнік. Мн., БелЭн, 2001.

Беларускія летапісы. Мн., 1998.

Вішнеўскі А. Ф. Гісторыя дзыржавы і права Беларусі. Мн. 2000.

Доўнар - Запольскі М. В. Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Мн., 1994.

Доўнар – Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1991.

Ермаловіч М. Беларуская дзяржава - Вялікае княства Літоўскае. Мн., 2000.

Ермаловіч Н. І. Па слядах аднага міфа. Мн., 1991.

Імя твае Белая Русь. Уклад Г. Сагановіча. Мн., 1991.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі X – XIX ст. Мн., 1995.

Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. І. Мн., 1994.

Полное собрание русских летописей. Т. 32. М., 1975.

Татищев В. Н. История Российская. Т. 1. М. – Л., 1962. С. 108; 355.

Францыск Скарына: і яго час. Энцыклапедычны даведнік. Мн. 1988 – С. 486 і інш.

Юхо Я., Абрамовіч А., Доўнар Т., Сатолін У. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага права. Мн.,2000.

Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мн., 2000.

Юхо Я. А. Гісторыяграфія гісторыі дзяржавы і права феадальнай Беларусі. Мн., 1999.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Т.1-6. Мн., 1993 – 2001.

Па кожнай тэме выкарыстоўваюцца матэрыялы перыядычнага друку (артыкулы, змешчаныя ў газетах і юрыдычных, гісторыка-прававых, гістарычных часопісах) і публікацыі, у якіх адлюстраваны вынікі навуковай дзейнасці калектыва юрыдычнага факультэта (матэрыялы навуковых і навукова-практычных канферэнцый, якія штогод праводзяцца на юрыдычным факультэце Белдзяржуніверсітэта), а таксама Нацыянальнай Акадэміі навук, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта і іншых навуковых і навучальных устаноў.

## ТЭМА 2
## ГРАМАДСКА – ПАЛІТЫЧНЫ ЛАД НА БЕЛАРУСІ Ў XIV- XVI ст. ст.

**Заняткі 3**

1. Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і міжнарожныя передумовы ўтварэння Вялікага княства Літоўскага. Канцэпцыі ўтварэння.
2. Аб'яднанне беларускіх княстваў у адну феадальную дзяржаву са сталіцай у Навагрудку. Яго адміністрацыйна – тэрытарыяльны падзел у XIV ст. Прававое становішча васальных княстваў.
3. Прававое становішча вялікіх князёў Вялікага княства Літоўскага у XIV ст. (на прыкладзе Віценя, Гедыміна, Яўнуція, Альгерда, Кейстута, Ягайлы, Скіргайлы).

**Заняткі 4**

1. Грамадскі лад на Беларусі ў XIV- XVI ст. ст. Класы і саслоўі: паняцце, працэс фарміравання.
2. Клас феадалаў і клас феадальна залежных людзей.
3. Саслоўе шляхты. Паходжанне шляхты. Прававое становішча.
4. Сацыяльнае і прававое становішча розных груп сялян. Баяры, сяляне цяглыя, асадныя, агароднікі, халупнікі, кутнікі, даннікі.
5. Мяшчане беларускіх гарадоў. Іх занятак, прававое становішча. Цэхі. Брацтвы.

**Заняткі 5**

1. Змены ў палітычным ладзе. Цэнтралізацыя дзяржавы ў канцы XIV – XV ст. ст. Вялікія князі Вялікага княства Літоўскага: Вітаўт. Свідрыгайла, Жыгімонт Кейстутьевіч, Андрэй Казімір, Аляксандр, Жыгімонт Казіміравіч, Жыгімонт Аўгуст, Генрых Валуа, Стэфан Баторый. Жыгімонт Ваза.
2. Сойм Вялікага княства Літоўскага.
3. Рада Вялікага княства Літоўскага.
4. Мясцовыя органы ўлады (у ваяводстве, павеце, горадзе, воласці).

**Заняткі 6**

1. Уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. Крэўская і Гарадзельская уніі.

2. Значэнне Крэўскай ўніі для Грунвальдскай перамогі над крыжакамі.

3. Узаемаадносіны паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай пры вялікім князі Казіміры.

4. Люблінская ўнія: дагавор і рэчаіснасць.

Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. і яе дзяржаўнае-палітычнае значэнне.

## ТЭМА 3
## СУДОВАЯ СІСТЭМА
## ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**Заняткі 7**

1. Судовая сістэма. Гаспадарскі (вялікакняжацкі) суд, яго склад, парадак дзейнасці. Яго разнавіднасці.

2. Галоўны суд або (Галоўны трыбунал). Парадак яго фарміравання і дзейнасці.

3. Мясцовыя суды для шляхты: замкавы (гродскі), земскі, падкаморскі, каптуровы.

4. Суды для мяшчан і сялян. Вайтоўска – лаўнічы суд. Копны суд. Вотчынны суд феадала над залежнымі людзьмі.

5. Асноўныя палажэнні феадальнага працэсуальнага права.

### Літаратура да заняткаў 3 – 7


1. Акты, издаваемые Виленскаой археографической комиссией: В 39 т. Вильно. 1864-1915.

1. Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. даведнік. Мн., БелЭн, 2001.

2. Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. 1959. Документы №34, 43, 49, 51, 83, 90.

3. Вішне?скі А.Ф., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ? дакументах і матэрыялах. Мн.,1998., стар. 27-160.

4. Вішнеўскі А. Ф. Гісторыя дзыржавы і права Беларусі. Мн., 2000.

5. Доўнар – Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

6. Довнар Т.И., Шелкопляс В.А. Уголовное право феодальной Беларуси. (XV – XVI вв.) Мн., 1993.
7. До?нар Т.І. Закон продка? нашых. // Судовы веснік. 1992, №3.
8. Доўнар Т.І. Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду (па Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 г.г.). Мн., 2001.
9. Ермаловіч М. Беларуская дзяржава - Вялікае княства Літоўскае. Мн., 2000.
10. Ермаловіч Н. І. Па слядах аднага міфа. Мн., 1991.
11. Краўцэвіч А. К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. Мн., 1998.
Метрыка Вялікага Княства Літоўскага (кнігі судовых спраў).
Мысліцелі і асветнікі Беларусі X – XIX ст. Мн., 1995.
Нарысы гістрыі Беларусі. Ч. І. Мн., 1994.
Полное собрание русских летописей. Т. 32. М., 1975.
Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Мн.,1960.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1588г: Тэксты. Давед. Камент. Мн.,1989.
Татищев В. Н. История Российская. Т. 1. М. – Л., 1962.
Францыск Скарына: і яго час. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1988
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Мн., 1993 – 2001.
Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мн., 2000.
Юхо І.А. Фарміраванне тэрыторыі беларуса?. // Спадчына.1991. №6.

## ТЭМА 4
## КРЫНІЦЫ БЕЛАРУСКАГА ФЕАДАЛЬНАГА ПРАВА

**Заняткі 8**

1. Старажытныя дагаворныя граматы.
2. Агульназемскія прывілеі 1387, 1413, 1434.
3. Канстытуцыйнае значэнне прывілеяў Казіміра 1447 г., Аляксандра 1492 г. і Жыгімонта 1506 г.
4. Абласныя граматы: Віцебскай зямлі 1503 г., Смаленскай – 1505 г., Полацкай – 1511 г. і інш.
5. Валасныя граматы.
6. Прывілеі беларускім гарадам на магдэбургскае права

7. Устава на валокі 1557 г.

**Заняткі 9**

1. Судзебнік 1468 г. Яго змест і значэнне ў развіцці беларускага права.
2. Гісторыя распрацоўкі і прыняцця Статута Вялікага княства Літоўскага 1529 г. Крыніцы Статута.
3. Канстытуцыйнае права ў Статуце 1529 г.
4. Гісторыя распрацоўкі Статута Вялікага княства Літоўскага 1566 г. Змест і асноўныя змены.

**Заняткі 10**

1. Гісторыя распрацоўкі і прыняцця Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г.
2. Тэарытычныя палажэнні, выкладзеныя ў прадмове да Статута - Прысвячэнні і ў Звароце Льва Сапегі адносна дзяржавы, паходжанні права і яго прызначэнні і інш.
3. Канстытуцыйнае і адміністрацыйнае права ў Статуце 1588 г.
4. Асновы цывільнага (грамадзянскага права) па Статуту 1588 г.
5. Крымінальнае права па Статуту 1588 г.
6. Працэсуальнае права.

## Літаратура да заняткаў 8-10


1. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией: В 39 т. Вильно. 1864-1915.
2. Васілевіч Р.А., Доўнар Т.І., Юхо І.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі. Мн., 2001.
3. Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1998.
4. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мн., 2000.
5. Довнар Т. И. Шелкопляс В. А. Уголовное право феодальной Беларуси (XV – XVI вв.) Мн., 1995.
6. До?нар Т.І. Закон продка? нашых. // Судовы веснік. 1992, №3.
7. Доўнар Т. І. Канстытуцыйнае права Беларус феадальнага перыяду (па Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 г.г.). Мн., 2001.

8. Доўнар Т.І. Развіцце асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV-XVI стагоддзях. Мн. 2000.
9. Доўнар Т.І. Помнікі права Беларусі феадальнага перыяду. Мн., 2001.
10. Доўнар Т.І. Статут 1588 года – крыніца права феадальнай Беларусі XVI – XIX стагоддзяў // Веснік БДу. 1989. № 1.
11. Крымінальнае права Беларусі: (закон, злачынства, адказнасць). Навуч.дап. Баркоў А.У., Грунтоў І.А., Доўнар Т.І. і інш. Мн., 1997. Гл.14.
12. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага (кнігі судовых спраў).
13. Пичета В.И. Белоруссия и Литва XV-XVI в.в. М.,1961.С.61-92.
14. Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Мн.,1960.
15. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588г: Тэксты. Давед. Камент. Мн.,1989.
16. Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мн., 2000.
17. Юхо Я., Абрамовіч А., Доўнар Т., Сатолін У. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага права. Мн., 2000.
18. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Т.1-6. Мн., 1993 – 2001.

## ТЭМА 5
## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЛАД І ПРАВА НА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ІСНАВАННЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

**Заняткі 11**

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Кароль і Сойм, іх прававое становішча ў XVIII ст.

Адасобленасць ВКЛ. Спробы правядзення рэформаў у другой палове XVIII ст.

Першы падзел Рэчы Паспалітай.

Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 1791 г.

Таргавіцкая канфедэрацыя. Гродзенскі сойм 1793 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

Паўстанне пад кіраўніцтвам А. Т. Касцюшкі.

Ліквідацыя Рэчы Паспалітай і далучэнне Беларусі да Расіі.

### Літаратура

1. Bardach Ju., Lesnodorski B., Pietrzak M. Historia ustroju i prawa Polskego. Warsawa, 2001.
2. Бардах Ю., Леснодорский Л., Пиетрчак Ю. История государства и права Польши. М.,1980.
3. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах (IX - XVIII стст.). 1936. Т.1.
4. Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей. Т.1. М. 1956.
5. Иловайский Д. Гродненский сейм 1793 года. М., 1870.
6. Краткая история Польши. М., 1993.
7. Мартенс Ф. Собрание трактатов и конвенций, заключенных Россиею с иностранными державами. СПб., 1875. Т.2.
8. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. Мн., 1994
9. Хрестоматия по истории южных и западных славян. Мн., 1987.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Т.1-6. Мн., 1993 – 2001.

Юхо Я.А. За вольнасць нашу і вашу. Мн., 1990.

## ТЭМА 6
## ГРАМАДСКА – ПАЛІТЫЧНЫ ЛАД І ПРАВА НА БЕЛАРУСІ Ў СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

**Заняткі 12**

1. Адміністрацыйна – тэрытарыяльны падзел Беларусі. Губерні, паветы (уезды), воласці. Органы мясцовага кіравання. Суды.
2. Спроба кадыфікацыіі права Заходніх губерняў. Праект Звода законаў Заходніх губерняў. Адмена дзеяння Статута 1588 г.
3. Скасаванне прыгоннага права. Прававое становішча сялян пасля рэформ. Органы мясцовай улады і сялянскае самакіраванне.
4. Земская рэформа. Асаблівасці яе правядзення на Беларусі.
5. Судовая рэформа. Асаблівасці яе правядзення на Беларусі.
6. Рэвалюцыя 1905-1907 гг. Царскі Маніфест 6 жніўня 1905 г. Царскі Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Беларускія дэпутаты ў складзе Дзяржаўнай думы Расіі.

### Літаратура

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. Мн., 1961.
Виленский Б. В. Судебная реформа и контрреформа в России. Саратов, 1969.
Государственная Дума в России в документах и материалах. М., 1957.
Крестьянская реформа в России 1861 года. Сборник законодательных актов. М., 1954.
Каліноўскі К. За нашую вольнасць: Творы, дакументы. Мн., 1999
Нарысы гісторыі Беларусі. Частка 1. Мн., 1994. С. 303-319.
Полное собрание законов Российской империи. СПб, 1830-1916.
Российское законодательство X-XX вв. В 9 т. М., 1987-1991 (т.т.5-9).
Свод местных законов Западных губерний (проект). СПб, 1910.
Слабожанин В. П. Земское самоуправление в Белоруссии (1905-1917) Мн., 1994.
Судебная реформа. Т. 1-2. М., 1915 г.
Фридман М. Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958.
Шелкопляс В. А. Судебные органы в Беларуси (конец XVIII-пер. пол. XIX вв.). Мн., 1997.

## Тэма 7
## РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПЕРАМЕНЫ І ЗМАГАННЕ ЗА АДРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (1917-1920 гг.)

**Заняткі 13**

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. Дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый. Беларускі нацыянальны камітэт (БНК).

Усталяванне Савецкай ўлады на Беларусі. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту, яго Прэзідыум і Савет народных камісараў.

Усебеларускі з'езд (Кангрэс) у Мінску ў снежні 1917 г. Рада Усебеларускага з'езду і яе выканаўчы камітэт.

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Устаўныя граматы.

**Заняткі 14**

Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам), аддзел Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР і яго дзейнасць.

Дырэктывы Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцяў РСФСР пра ўтварэнне ўрада БССР.

Першы з'езд Кампартыі Беларусі і яго рашэнні. Пытанне аб тэрыторыі Беларускай ССР.

Часовы Рабоча – Сялянскі урад БССР і яго Маніфест.

Дзейнасць урада БССР.

Першы з'езд Саветаў Беларусі. Зварот і дэкларацыі з'езда. Пастанова Прэзідыўма Ўсерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага камітэта аб прызнанні незалежнасці БССР.

Змяншэнне тэрыторыі БССР.

**Заняткі 15**

1. Канстытуцыя Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі.
2. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання ССРБ.
3. Утварэнне і дзейнасць Літоўска – Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.
4. Аднаўленне Беларускай ССР. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнай ССРБ 1920 г.
5. Другі з'езд Саветаў Беларусі. Дапаўненні да Канстытуцыі ССРБ.

## Літаратура да заняткаў 13, 14, 15


1 Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918-1920. Т. Т. 1-2. Мн., 1968-1971.
2 Архівы БНР. Мн., 1999.Т.1. Ч.1-2.
3 Васілевіч Р.А., Доўнар Т.І., Юхо І.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі. Мн., 2001.
4 Декреты Советской власти. Т. Т. 1-4. М., 1957 – 1968.
5 Довнар Т. И. Краткий очерк истории государства и права Беларуси. Мн., 1997.
6 Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Т. IV. Мн., 1954.
7 История государства и права Белорусской ССР. Т.1. Мн.,1970.

8 История Советской Конституции / под ред. С.С.Студеникина (1917-1956). М., 1957.
9 Круталевич В. А. История Беларуси: становление национальной державности (1917-1922). Мн., 1999.
10 Круталевіч В. А., Юхо І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.) Мн., 2000.
11 Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. На пераломе эпох: станаўленне Беларускай дзяржаўнасці. (1917-1920) Мн., 1999.
12 Маргунский С. П. Создание и упрочнение белоруской государственности. Мн., 1958.
13 Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. Мн., 1995.
14 Турук Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов. М., 1921. (Переиздано: Минск, 1993).
15 Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. Киев, 1919 (переиздано: Минск,1992).
16 Широков А.Т. ЦИК Белорусской ССР в 1919-1936 гг. Мн., 1979.
17 Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 Т. Т.1-6. Мн., 1993-2001.
18 Юхо Я.А. Фарміраванне тэрыторыі беларусаў / Спадчына, 1991, № 6.
19 Юхо Я.А.Беларускія ўрады у 1918-1921 гг. і іх паўнамоцтвы / Беларускі гістарычны часопіс. 1993, № 4.

## ТЭМА 8
## ДЗЯРЖАВА І ПРАВА БЕЛАРУСКАЙ ССР Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС (1920-1940 гг.)

**Заняткі 16**

1. Пераход да Новай эканамічнай палітыкі. Структура і кампетэнцыя вышэйшых і мясцовых органаў Беларускай ССР у 1921-1923 гг.
2. Узаемаадносіны БССР з РСФСР да 1923 г. Саюзны Рабоча – Сялянскі дагавор паміж РСФСР і ССРБ.
3. Утварэнне СССР.
4. Вяртанне ў склад Беларускай ССР усходніх раёнаў Беларусі ў 1924-1926 г.
5. Змены ў Канстытуцыі БССР у 1924 г. Асноўныя моманты ў правядзенні нацыянальнай палітыкі ў Беларускай ССР у 1922 – 1927 гг.

6. Канстытуцыя БССР 1927 г.

**Заняткі 17**

1. Эканамічнае становішча БССР. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі.
2. Парушэнне законнасці і рэпрэсіі на Беларусі ў 30-я гады.
3. Развaццё права БССР у 20-30-я гады.
4. Канстытуцыя СССР 1936 г. Канстытуцыя БССР 1937 г.
5. Структура і кампетэнцыя вышэйшых і мясцовых органаў дзяржаўнай улады ў БССР.
6. Змены ў адміністрацыйным, грамадзянскім праве. Калгаснае, зямельнае права і інш.

## Літаратура да заняткаў 16-17


Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20-50 –ых гадоў на Беларусі. Мн., 1994.

Васілевіч Р.А., Доўнар Т.І., Юхо І.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі. Мн., 2001.

Декреты Советской власти. Т. 1-4. М., 1957 – 1968.

Довнар Т. И. Краткий очерк истории государства и права Беларуси. Мн., 1997.

Вишневский А. Ф. Довнар Т. И. История государства и права Беларуси (1917-1996) Мн., 1996.

Вишневский А. Ф. Очерки истории государства и права Республики Беларусь. Мн., 1995.

Ігнатоўскі У.М. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX стагоддзя. Мн., 1923.

История государства и права БССР. Т. 2. Мн., 1976.

История Советской Конституции / под ред. С.С. Студеникина (1917-1956 г.г.). М., 1957.

Касцюк М.. Сталіншчына і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1995, N 1.

Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской Республики. Мн.,1976.

Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской Республики. Мн., 1979.

Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мн., 2000.

Круталевіч В. А., Юхо І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1998.
Мартинович И.И. История суда в БССР. Мн., 1958.
Нарысы па гісторыі Беларусі. Ч.II. Мн., 1995.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1-6. Мн., 1993-2001.

## ТЭМА 9
## ДЗЯРЖАВА І ПРАВА БССР У ПЕРЫЯД ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**Заняткі 18**

1. Заходняя Беларусь пад прыгнетам паліцэйска-бюракратычнага рэжыму Польшчы.
2. Мясцовыя органы дзяржаўнай улады ў Заходняй Беларусі ў 1921-1938г.г.
3. Гітлераўская агрэсія супраць Польшчы і пачатак Другой сусветнай вайны. Пакт Молатава - Рыбентропа.
4. Уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Утварэнне часовых органаў улады ў Заходняй Беларусі.
5. Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі і яго дзяржаўна-прававыя акты.
6. Утварэнне Савецкіх органаў улады ў заходніх раёнах Беларускай ССР.

### Літаратура

1. Бардах Ю., Леснодорский С., Пиетрчак Ю. История государства и права Польши. М., 1980.
2. Бергман А. Слова права Браніслава Тарашкевіча. Мн., 1996.
3. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы. Т.1-2. Мн., 1962.
4. История государства и права БССР. Т. 2. Мн., 1976.
5. Круталевіч В. А., Юхо І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мн., 2000.
6. Очерки истории государства и права БССР. Выпуск 2. Мн., 1969г. Приложение № 2,3,4.
7. Павлов Я.С. Советско-германские договоры 1939-1941 гг.: трагедия тайных сделок. Мн., 1996.

8. Палуян У.А. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Мн., 1967.

**Заняткі 19**

Напад гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз. Прычыны няўдач Чырвонай Арміі ў першыя месяцы вайны.

Нямецкі акупацыйны рэжым на Беларусі.

Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашыстскай акупацыі і адбудова дзяржаўнага апарата рэспублікі.

Пачатак аднаўлення замежных сувязяў БССР. Удзел БССР у ААН.

Змены ў заканадаўстве.

### Літаратура


1. Бровка Ю. П. Белорусская ССР – суверенный участник международного общения. Мн., 1974.
2. Великая Отечественная война Советского Союза 1941-1945 г.г. М., 1970.
3. Гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік. Мн., 1994.
4. История гоударства и права БССР. Ч.2. Мн., 1976.
5. Жуков Г.К. Воспоминания и размышления. М., 1969.
6. Круталевич В.А., Юхо І.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Ч.ІІ. Мн., 1998.
7. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. Мн., 1995.
8. Павлова Л.В. Органы власти и управления БССР в период Великой Отечественной войны // Правоведение. 1979. № 1.
9. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993.
10. Сборник документов и материалов по истории СССР (1917-1958). М., 1959.
11. Сборник законов Белорусской ССР.1938-1967. Мн., 1968-1969.Т.1-2.
12. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1-6. Мн., 1993-2001 (т. 3 «акупацыйны рэжым» і інш.).


## ТЭМА 10
## ДЗЯРЖАВА І ПРАВА БЕЛАРУСКАЙ ССР У ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1945-1984 гг.)

**Заняткі 20**

Адбудова народнай гаспадаркі і культуры ў БССР у пасляваенны перыяд.

Змены ў структуры і кампетэнцыі органаў кіравання.

XX з'езд КПСС і значэнне яго рашэнняў для паслаблення рэпрэсіўнага рэжыму і пашырэння правоў рэспублікі.

Канстытуцыя БССР 1978г.

Развіццё права БССР.

### Літаратура


Бровка Ю.П. Международная правосубъектность БССР. Мн., 1969.

История государства и права БССР. Т.2. Мн., 1976.

История Советской Конституции. М., 1957.

Очерки истории государства и права БССР. Вып.2. Мн., 1969.

XX съезд КПСС. Стенографический отчет. М., 1956.

Конституция (Основной закон) Белорусской (1978 г.). Мн., 1978.


## ТЭМА 11
## ДЗЯРЖАВА І ПРАВА БЕЛАРУСІ ? ПЕРЫЯД ПРАВЯДЗЕННЯ КАРДЫНАЛЬНЫХ РЭФОРМ І ПЕРАХОДУ ДА ДЗЯРЖА?НАЙ САМАСТОЙНАСЦІ

**Заняткі 21**

1. Структура і кампетэнцыя вышэйшых органаў улады Беларусі. Змены ў Канстытуцыі Беларускай ССР 1978.
2. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Дэкларацыя аб суверэнітэце.
3. Распад Саюза ССР і ўтварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў.
4. Развіццё канстытуцыйнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека.
5. Міжнародныя сувязі Рэспублікі Беларусь
6. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.
7. Развіццё права Рэспублікі Беларусь.

## Літаратура


1. Белоруссия и Россия: общества и государства. М., 1997.
2. Василевич Г.А. Верховный Совет Беларуси. Мн., 1993.
3. Вішнеўскі А. Ф., Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі у дакументах і матэрыялах. Мн., 1998г.
4. Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 1991-1996 г.г.
5. Верховный Совет Республики Беларусь: история и современность (1923-1998) Мн., 1998.
6. Довнар Т. И. Краткий очерк истории государства и права Беларуси. Мн., 1997.
7. Збор пастаноў Урада Беларускай ССР (з 1991 Урада Рэспублікі Беларусь). 1990-1998. г.г.
8. Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь.1994-1996.
9. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Мн., 1994.
10. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі. Мн., 1996.
11. Коршук В.К., Платонов Р.П., Романовский И.Ф. Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий. Мн., 1999.
12. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. Мн., 1995.
13. Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. 1999-2002.
14. Система права и законодательства Республики Беларусь: состояние и перпективы развития. / Материалы науч.конф. Гродно. 1999.
15. «Судовы Веснік» за 1992-2001 г.г.

## ТЭМАТЫКА І ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКА?
**для студэнтаў завочнай формы навучання**

## ТЭМА 1
## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЛАД І ПРАВА БЕЛАРУСІ ? IX-XII ст.ст.

1. Прадмет, асаблівасці, задачы навукі гісторыі дзяржавы і права. Паходжанне назвы "Беларусь".

3. Усталяванне дзяржаўнасці на Беларусі.

4. Полацкая, Тура?ская і іншыя дзяржавы X-XII ст.ст. Грамадскі і палітычны лад.

Асноўныя рысы старажытнага звычаевага права. Дагавор 1229 г. Васальныя граматы.

## ЛІТАРАТУРА


Алексеев Л.В.Полацкая земля в IX-XIII вв. М., 1966.

Белая Русь. / Пад рэд. Г.Сагановіча. Мн., 1991.

Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі IX-пач. XX ст.:курс лекцый. Мн., 1996.

Вішне?скі А.Ф., Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ? дакументах і матэрыялах. Мн., 1998.

Гобарев В.М. Предыстория Руси. Ч.1-2.М., 1994.

4.До?нар Т.І. Грамадзянскае права феадальнай Беларусі XV-XVIст.ст. Мн.,1997.

До?нар Т.І. Артыкулы ? «Судовым Весніку» за 1992-1993г.г.

Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1991.

Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.1. Мн., 1994.

Памятники русского права. Вып. второй. М., 1953.

Рыбаков Б.А. Киевская Русь и русские княжества IX-XII в.в.М., 1982.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1-6. Мн., 1994-2001.

10 Юхо І.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.

Юхо І.А. Крыніцы беларуска-літо?скага права. Мн., 1991.

Юхо І.А. Фармаванне тэрыторыі беларуса?. // Спадчына. 1991.


Акрамя таго, выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы да кожных семінарскіх занятка? неабходныя раздзелы з розных падручніка? па

гісторыі дзяржавы і права Беларусі, гісторыі Беларусі, артыкулы з часопіса? і газет.

## ТЭМА 2
## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЛАД І ПРАВА НА БЕЛАРУСІ Ў XIV – XVI ст.ст.

Утварэнне Вялікага княства Літоўскага. Яго тэрыторыя. Беларускія землі ? складзе Вялікага княства Літоўскага.

Клас феадалаў і саслоўе шляхты, іх прававое становішча.

Клас феадальна-залежнага насельніцтва, саслоўе простых людзей.

Мяшчане, іх прававое становішча.

Вышэйшыя органы ўлады і кіравання. Вялікі князь. Сойм. Рада. Службовыя асобы. іх прававое становішча.

Мясцовыя органы ўлады і кіравання (у ваяводстве, у павеце,у воласці, у горадзе).

Крэўская ўнія і Гарадзельская ?нія. Адна?ленне ?ніі пры вялікім князі Казіміры.

## ТЭМА 3
## КРЫНІЦЫ БЕЛАРУСКАГА ФЕАДАЛЬНАГА ПРАВА

Агульназемскія прывілеі 1387, 1413, 1434, 1447, 1492, 1506 г. г.

Абласныя і валасныя прывілеі.

Прывілеі гарадам на магдэбургскае права.

Судзебнік 1468 г.

Гісторыя распрацоўкі Статута Вялікага княства Літоўскага 1529г. Агульная характарыстыка і асно?ныя палажэнні.

Статут 1566г. Асно?ныя змены і адрозненні ад Статута 1529 года.

Статут 1588г. Яго змест і значэнне.

Канстытуцыйнае права па Статуту 1588 г.

Асновы цывільнага (грамадзянскага) права па Статуту 1588 г.

Крымінальнае права па Статуту 1588 г.

## ЛІТАРАТУРА

1. Белоруссия в эпоху феодализма. Т.1.1959. Документы № 34, 43, 49, 51, 83, 90, 116.

2. Вішне?скі А.Ф., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ? дакументах і матэрыялах. Мн., 1998.

3. До?нар Т.І. Закон продка? нашых // Судовы веснік. 1992, №3.

Довнар Т.И., Шелкопляс В.А. Уголовное право феодальной Беларуси. Мн., 1994.

Доўнар Т. І. Грамадзянскае права феадальнай Беларусі XV- XVI стагоддзя?. Мн., 1997.

До?нар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

Ермаловіч М.І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. Мн, 2000.

Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Мн. ,1960.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1588г., Мн., 1989.

Пашуто В.Т. Образование Литовского государства. М., 1959.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 т. Т.1-6. Мн.: БелЭн, 1994-2001.

Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.

Юхо І.А. Крыніцы беларуска-літо?скага права. Мн, 1991.

Юхо І.А. Уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай // Полымя, 1972. № 1.

Юхо І.А. Фарміраванне тэрыторыі беларуса? // Спадчына. 1991.

## ТЭМА 4
## РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПЕРАМЕНЫ І ЗМАГАННЕ ЗА АДРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (1917-1922 гг.)

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. Дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый.

Усталяванне Савецкай ўлады на Беларусі. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту, яго Прэзідыум і Савет народных камісараў.

Усебеларускі з'езд (Кангрэс) у Мінску ў снежні 1917г. Рада Усебеларускага з'езду і яе выканаўчы камтэт.

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Устаўныя граматы БНР.

Першы з'езд Кампартыі Беларусі, яго рашэнні.

Часовы рабоча-сялянскі ?рад БССР і яго Маніфест.

Першы з'езд Саветаў Беларусі і яго дэкларацыі.

Канстытуцыя Беларускай ССР 1919 г.

Утварэнне Літоўска-Беларускай ССР.

Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнай Беларускай ССР 1920 г.

Другі з'езд Саветаў Беларусі. Дапаўненні да Канстытуцыі БССР.

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 1, 2.
2. Довнар Т. И. Краткий очерк истории государства и права Респулики Беларусь (послеоктябрьский период). Мн., 1997.
3. Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.
4. История государства и права БССР. Т.1. Мн., 1970.
5. История Советской Конституции (1917-1956). М., 1957.
6. Круталевич В.А. Рождение Белорусской Советской Республики. Мн., 1975.
7. Круталевіч В. А., Юхо І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917-1945 г. г.). Мн., 1998.
8. Канчер Е. Белорусский вопрос. Петроград, 1919.
9. Методические рекомендации по истории государства и права БССР. Мн., 1989.
10. "Спадчына". 1991, №№ 1-4.


У залежнасці ад плана пэ?нага навучальнага года тэмы і пытанні семінарскіх занятка? і колькасць гадзін могуць некалькі змяняцца.

## ПАДРЫХТОЎКА І АБАРОНА КУРСАВОЙ РАБОТЫ

Курсавая работа з'яўляецца адной з формаў творчай самастойнай працы студэнтаў I-V курсаў, якія прадугледжана вучэбным планам. Як правіла, яна цесна звязана з навуковай тэматыкай кафедры і яе супрацоўнікаў. Тэматыка курсавых работ кожны год пераглядаецца і зацвярджацца на пасяджэнні адпаведнай кафедры (спіс на 2002/2003 вучэбны год прыкладаецца). Студэнт можа самастойна прапанаваць тую ці іншую тэму, аднак яна перш за ўсё павінна арыентавацца на тыя праблемы, якія істотна пашыраюць і паглыбляюць юрыдычныя веды. Такія работы, як правіла павінна Ўзгадняцца з навуковым кіраўніком і зацвярджаецца кафедрай. Аптымальна, калі б тэма курсавой была поўным чынам звязана з будучай працоўнай дзейнасцю студэнта. Такія работы, носяць больш творчы характар, утрымліваюць пэўныя вывады і прапановы па ўдасканальванню дзеючага заканадаўства, вызываюць цікавасць іншых студэнтаў.

У пачатку кожнага навучальнага года студэнты падаюць адпаведную заяву на кафедру (форма заявы маецца на кафедры), у якой просяць зацвердзіць абраную тэму курсавой работы і навуковага кіраўніка. Толькі пасля зацвярджэння кафедрай тэмы курсавой работы і навуковага кіраўніка студэнт прыступае да напісання работы. План работы, як правіла, распрацоўваецца студэнтам самастойна. Таксама самастойна складаецца і спіс літаратурных крыніц, якімі будзе карыстацца студэнт пры напісанні курсавой працы. Затым план работы і спіс літаратуры ўзгадняюцца з навуковым кіраўніком. Разам з навуковым кіраўніком студэнт удакладняе, абмяркоўвае усе пытанні, звязаныя з напісаннем работы, для чаго ён перыядычна прыходзіць на кансультацыі. Чарнавы варыянт работы прадстаўляецца па патрабаванню навуковага кіраўніка на канчатковую праверку. Пры неабходнасці студэнт можа азнаёміцца на кафедры з узорамі курсавых работ. Курсавая работа павінна прадстаўляцца на кафедру ў вызначаны дэканатам тэрмін.

У працэсе выканання курсавых работ студэнты набываюць і ўдасканальваюць навыкі навукова-даследчай працы. Яны авалодваюць правільнай метадалогіяй, прыёмамі падбору і сістэматызацыі літаратурнага, дакументальна-прававога, статыстычнага матэрыялу, а таксама ўменнем правільна аналізаваць сабраны матэрыял, рабіць абагульненні і адпаведныя вывады.

Паступова ў студэнта фарміруецца і развіваецца навуковае мысленне, выпрацоўваюцца навыкі самастойнага выкладання і афармлення вынікаў навукова-даследчай працы.

Галоўнай задачай курсавых работ (а ў будучым і дыпломнай работы) з'ўляецца развіццё ў студэнтаў здольнасці да навуковай творчасці, у тым ліку развіццё ўмення публічна, тэзісна выкладаць вынікі сваей працы. Ужо на першым курсе курсавая работа павінна ўтрымліваць у сабе элементы навуковага пошуку, адлюстроўваць творчую ініцыятыву і актыўнасць студэнта. Студэнт набывае вопыт працы з літаратурным і дакументальна-прававым матэрыялам, вучыцца адбіраць з прачытанай літаратуры самыя важныя і неабходныя для яго курсавой працы палажэнні, стараецца паслядоўна і лагічна размясціць матэрыял у адпаведнасці з распрацаваным планам і інш.

На наступных курсах наяўнасць у курсавой працы творчага элемента (збор арыгінальных фактычных дадзеных, самастойнае тлумачэнне палітыка-прававых з'яў і ўласцівасцей пэўных прававых інстытутаў, выяўленне негатыўных момантаў і тэндэнцый у развіцці дзяржаўнасці і права і шляхоў іх пераадолення і г. д.) разглядаецца як галоўная яе вартасць. Такая работа пры належнай абароне ацэньваецца вышэйшым балам.

У ходзе напісання курсавой работы студэнт павінен прачытаць, асэнсаваць асноўную і дапаўняльную літаратуру, выбраць патрэбны матэрыял, зыходзячы з вызначаных раздзелаў курсавой (або дыпломнай) работы.

Трэба мець на ўвазе, што на юрыдычным факультэте да паслуг студэнтаў бібліятэка і лабараторыя заканадаўства, а таксама алфавітныя і прадметныя каталогі на кафедрах.

Асноўнай формай вывучэння літаратуры з'яўляецца складанне канспекта прачытаных кніг, навуковых артыкулаў, заканадаўчых актаў. Як правіла, запісы робяцца сваімі словамі. Абзацы, асобныя палажэнні і сказы, узятыя цалкам з тэкста, пішуцца ў двукоссях з указаннем старонкі. Гэта неабходна для наступных спасылак у курсавой работе на адпаведную крыніцу. У канспекце пажадана адразу на палях адзначыць, да якога раздзела работы суадносіцца дадзены матэрыял, а таксама запісваць узнікшыя думкі і меркаванні адносна тых ці іншых палажэнняў, сумненні і ўзнікшыя пытанні (лепш за ўсе гэта рабіць на зваротным лісце канспекта).

Пры вывучэнні літаратуры патрэбны крытычныя адносіны студэнта да выкарыстоўваемых крыніц, асабліва да тых, якія былі выдадзены ў дарэвалюцыйны перыяд і папярэднія дзесяцігоддзі. У шэрагу з іх можна сустрэць вельмі супярэчлівыя погляды, састарэлыя навуковыя тэорыі, недастаткова лагічна абгрунтаваныя вывады, памылковы фактычны матэрыял, памылковую інтэрпрэтацыю і г. д. Менавіта таму ў ходзе даследавання праблемы патрэбна выпрацаваць уласны погляд на яе. Незразумелыя палажэнні і тэрміны патрэбна ўдакладняць у справачнай, энцыклапедычнай літаратуры, або звярнуцца да навуковага кіраўніка.

Пасля складання канспектаў неабходнага літаратурнага матэрыялу яго трэба асэнсаваць, вылучыць патрэбныя палажэнні, сістэматызаваць па адпаведных раздзелах і параграфах, удакладніць цыфравы матэрыял, статыстычныя дадзеныя, праверыць тыя цытаты, якія будуць выкарыстаны ў рабоце. Вынікі апрацоўкі статыстычных дадзеных можна аформіць у выглядзе табліц. Таблічная форма дазваляе выкласці матэрыял найбольш кампактна, рацыянальна і зручна. Да таго ж, табліцы з'яўляюцца найбольш пашыраным відам ілюстрацыйнага матэрыялу. Адной з формаў ілюстрацый з'яўляюцца таксама графікі і дыяграмы. На найбольш важныя і спрэчныя палажэнні законспектаванага літаратурнага матэрыялу павінны быць аформлены ў курсавой рабоце належным чынам спасылкі. Пры неабходнасці азнаямлення з архіўным матэрыялам або нарматыўна-прававым матэрыялам, дзяржаўных і іншых устаноў патрэбна атрымаць у дэканаце адпаведнае дазваленне і хадайніцтва.

Пажадана, каб студэнты выкарыстоўвалі тыя публікацыі, у якіх былі б адлюстраваны вынікі навуковай дзейнасці калектыва юрыдычнага факультэта.

Вельмі станоўчым момантам у курсавой рабоце будзе выкарыстанне матэрыялаў навуковых і навукова-практычных канферэнцый, якія амаль штогод праводзяцца на юрыдычным факультэце БДУ, у Нацыянальнай Акадэміі навук, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце і іншых установах, а таксама выкарыстанне навуковых артыкулаў, змешчаных у юрыдычных, гісторыка-прававых, гістарычных часопісах (абавязкова патрэбна афармляць адпаведныя спасылкі на выкарыстаны матэрыял).

Пры непасрэдным напісанні курсавой работы магчымы два падыходы. Першы заключаецца ў тым, што на падставе асэнсаванага,

сістэматызаванага матэрыялу пішацца ўся работа паслядоўна ад уводзін да заключэння. Другі падыход больш рацыянальны, калі асэнсоўваецца, сістэматызуецца матэрыял па кожнаму разделу паасобку. Пры гэтым папярэдне выкладаецца пэўны план кожнага разделу, які ў працэсе напісання можа змяняцца адпаведна падабранаму матэрыялу. Затым па кожнаму разделу робяцца вывады, якія потым абагульняюцца ў заключэнні работы.

Уводзіны пры гэтым можна пісаць адразу, або пасля завяршэння напісання асноўнага тэксту ( у гэтым выпадку лягчэй рабіць характарыстыку выкарыстанай па тэме літаратуры, якая, як правіла, робіцца ва ўводзінах). Ва ўводзінах ставяцца таксама мэта і задачы напісання курсавой работы, гаворыцца аб актуальнасці абранай тэмы.

Курсавая праца павінна, як правіла, уключаць наступныя структурныя часткі:

тытульны ліст,

рэферат (анатацыю) у памеры не больш адной старонкі тэкста,

змест з падзелам на пэўныя структурныя адзінкі (главы, параграфы і інш.) і з указаннем старонак размяшчэння,

асноўную частку работы (непасрэдна яе змест),

заключэнне,

спіс выкарыстаных крыніц (бібліяграфію),

дадатак (схемы, графічны матэрыял і інш.).

**РЭФЕРАТ** уяўляе сабой кароткі змест работы з указаннем яе аб'ёма і колькасьці старонак. Ён пачынаецца з назвы курсавой работы, пасля чаго ўказваецца прозвішча студэнта, затым прыводзяцца ключавыя словы, якія адлюстроўваюць асноўны змест работы. Пасля гэтага раскрываецца змест работы – кароткі пераказ матэрыялу з указаннем мэты работы, метадаў распрацоўкі і асноўных вынікаў даследавання.

Змест (аглаўленне) мае мэтай вызначэнне асноўных пытанняў, якія разглядаюцца ў курсавой рабоце, і хуткі пошук па тэксту неабходнага матэрыялу. Ён размяшчаецца за рэфератам і павінен уключаць увесь пералік загалоўкаў раздзелаў і падраздзелаў работы, пачынаючы з уводзінаў.

Ва ўводзінах, якія маюць мэтай ацэнку сучаснага стану разглядаемай праблемы, абгрутоўваецца актуальнасць абранай тэмы,

у сувязі з чым характарызуюцца літаратурныя крыніцы і даецца кароткая характарыстыка аб'екта даследавання.

Змест, склад і аб'ём курсавой працы залежаць ад спецыфікі тэмы і павінны адпавядаць зацверджанаму навуковым кіраўніком заданню. У працэсе напісання работы трэба звяртаць увагу на лагічную паслядоўнасць выкладання матэрыялу, пераканаўчасць аргументацыі, сціласць і дакладнасць фармулёвак, канкрэтнасць выкладання вынікаў даследавання. У тэксце не дапускаюцца: скарачэнне слоў (акрамя агульнапрынятых) і прымяненне для вызначэння аднаго і таго ж паняцця розных тэрмінаў.

Асноўная частка работы падзяляецца на раздзелы (главы), прычым кожны раздзел пачынаецца з новага ліста, і на падраздзелы (параграфы), назвы і паслядоўнасць размяшчэння якіх залежыць ад канкрэтнай тэмы работы і яе асаблівасцяў.

Галоўным патрабаваннем да напісання курсавой работы з'яўляецца самастойнасць у выкладанні матэрыялу. Нельга механічна перапісваць тэксты літаратурных крыніц, а таксама выпадкова падбіраць матэрыял і фактычныя дадзеныя без сувязі з тэмай і планам работы. Увесь матырыял павінен быць паслядоўным і ўзаемазвязаным на падставе агульнай ідэі і асноўнага зместу.

Кораткасць выкладання матэрыялу, зразумеласць перадачы думкі, паўната ахопу тэмы - галоўнае, што адрознівае навуковую творчасць.

Асноўныя палажэнні і вывады работы павінны быць тэарытычна даказаны і падмацаваны дакументальна-прававым матэрыялам, спасылкамі на думкі адпаведных вучоных - спецыялістаў па дадзенай праблеме. Студэнт павінен паказаць, што самастойна знаёміўся з літаратурнымі і дакументальнымі крыніцамі, таму ў рабоце павінны быць цытаты з адпаведных крыніц. Пры разглядзе дыскусійных пытанняў прыводзяцца, як правіла, пазіцыі ўсіх вучоных (са спасылкамі на адпаведныя кнігі, артыкулы ), даецца крытычная ацэнка іх і выказваюцца ўласныя меркаванні па азначанай праблеме.

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** павінна утрымліваць кароткія абагуленыя вывады па рабоце з вызначэннем таго новага, чаго дасягнуў студэнт пры распрацоўцы дадзенай тэмы. Могуць утрымлівацца і рэкамендацыі па выкарыстанню атрыманых вынікаў.

Мэтай усялякага даследавання з'яўляецца не проста абагульненне матэрыялу, але імкненне выказаць уласныя думкі і сказаць нешта новае, або хаця бы абагуліць пэўныя думкі,

сфармуляваць іх сваімі словамі, стылістычна граматна і дакладна з навуковага пункту гледжання. Выкарыстаныя ў рабоце тэрміны і вызначэнні павінны мець адзінае тлумачэнне на працягу ўсей работы і адпавядаць агульнапрынятым у навуковай літаратуры стандартам. Гэта ж тычыцца і ўмоўных азначэнняў і скарачэнняў слоў (і інш., гг., с., і г.д.). Самастойныя скарачэнні слоў увогуле недапушчальныя

Загалоўкі раздзелаў асноўнай часткі работы, а таксама загалоўкі: “УВОДЗІНЫ” ,“ЗАКЛЮЧЭННЕ”, “СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ” і інш. размяшчаюцца ўверсе, пасярэдзіне ліста і сіметрычна тэксту.

У канцы работы прыводзіцца спіс выкарыстанай літаратуры. Як правіла, ён даецца ў алфавітным парадку, аднак нарматыўна-прававы матэрыял, затым статыстычна-архіўны змяшчаецца наперадзе, замежная літаратура - ў канцы спіса.

Пры складанні спіса выкарыстанай літаратуры неабходна прытрымлівацца правілаў бібліяграфіі: указваць прозвішча і ініцыялы аўтара, назву кнігі (артыкулы, тэзісаў), месца і год выдання.

Работа пішацца на стандартных лістах паперы прыкладным памерам 203х288 мм. На лістах павінны быць палі (прыкладна: зверху 20 мм, знізу 25 мм, справа 10 мм, злева 35 мм.). Яна павінна быць напісаны выразлівым, разборлівым почыркам (як правіла, работа прадстаўляецца ў друкаваным выглядзе). Абзацы пішуцца з чырвонага радка. Адлегласць паміж радкамі павінна складаць 2 інтэрвалы. Нумарацыя старонак пачынаецца з трэцяй старонкі. Яна з’яўляецца скразной і прастаўляецца, як правіла, у правым верхнім вуглу без кропкі.

Курсавая работа прыкладным аб’емам 24 машынапісных старонкі павінна быць падшыта (пераплецена) у цвердую вокладку, афармленую ў выглядзе тытульнага ліста (гл. узор). Першай старонкай работы з’яўляецца тытульны ліст. На другой старонцы змяшчаецца план работы. Затым, ідуць уводзіны. Рэферат, як правіла, змяшчаецца пасля спіса літаратуры. У канцы работы павінен быць подпіс аўтара і дата выканання.

Не менш чым за два тыдні да абароны курсавая работа павінна быць пададзена на кафедру і зарэгістравана. Затым яна перадаецца навуковаму кіраўніку для праверкі. У абавязак навуковага кіраўніка не ўваходзіць рэдагаванне тэкста, аднак ён на палях можа рабіць заўвагі аб стылі, недакладных або незразумелых палажэннях і інш. У рэцэнзіі навуковы кіраўнік у адвольнай форме характарызуе змест

работы і адпаведнасць яго плану, паўнату, паслядоўнасць і абгрунтаванасць адказаў на пастаўленныя пытанні, ступень самастойнасці студэнта, яго ўменне абагульняць матэрыял і рабіць адпаведныя вывады і інш. Адзначаюцца таксама станоўчыя моманты работы і яе недахопы, тэарытычны ўзровень выканання і г.д. У выпадку істотных недахопаў курсавая работа не дапускаецца да абароны. Станоўча ацэненая работа (навуковы кіраунік можа выставіць папярэднюю адзнаку) дапускаецца да абароны.

Абарона курсавой работы, як правіла, адбываецца перад спецыяльнай камісіяй, у склад якой уваходзіць і навуковы кіраўнік. Студэнт робіць перад камісіяй кароткі даклад, у якім раскрывае змест сваей работы, уласныя пазіцыі па спрэчных пытаннях, адказвае на заўвагі рэцэнзента і на пытанні, якія задаюць члены камісіі. Пры гэтым ён павінен паказаць не толькі добрае веданне праблемы, але і ўменне абараняць свае погляды і ўяўленні адносна разгледжаных у рабоце пытанняў. Толькі ў выпадку належнай падрыхтоўкі да абароны і поўных абгрунтаваных адказаў на заўвагі рэцэнзента і членаў камісіі, папярэдняя адзнака, якая мела месца ў рэцэнзіі, можа быць павышана.

Адзнаку “выдатна” атрымліваюць тыя курсавыя работы, якія ўтрымліваюць элементы навуковай творчасці; “добра” - работы, у якіх абагулены шматлікія крыніцы і на падставе гэтага поўна, усебакова і аргументавана разгледжаны ўсе пытанні; “здавальняюча” - работы, у якіх правільна і дастаткова поўна дадзены адказы на пастаўленыя пытанні. Адзнака за курсавую работу ставіцца ў экзаменацыйную ведамасць і залікоўку студэнта.

## ТЭМАТЫКА КУРСАВЫХ РАБОТ
## па курсу "ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ"

1. Дзяржавы-княствы на тэрыторыі Беларусі ў IX-XII ст. ст. і іх грамадскі лад (на прыкладзе Полацкага, Віцебскага, Турава-Пінскага і інш.княстваў).
2. Звычаёвае права Беларусі і яго адлюстраванне ў пісаным заканадаўстве.
3. Міжнародныя пагадненні і васальныя дагаворы – крыніцы старажытнага беларускага права.
4. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага і яго адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у XIV-XVI ст. ст.
5. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа на Беларусі ў XVI ст.
6. Прававое становішча шляхты на Беларусі ў XV-XVII ст. ст.
7. Прававое і сацыяльнае становішча сялян Беларусі ў XV - XVII ст. ст.
8. Прававое і сацыяльнае становішча мяшчан Беларусі ў XIV-XVII ст. ст.
9. Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага ў XV-XVI ст. ст.
10. Сойм і рада ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI XVII ст. ст.
11. Мясцовыя органы дзяржаўнай улады на Беларусі ў XV-XVII ст. ст.
12. Органы кіравання ў гарадах Беларусі ў XV-XVII ст. ст. (па магдэбургскаму праву).
13. Крэўская і Гарадзельская ўніі.
14. Люблінская ўнія 1569 г.
15. Берасцейская царкоўная ўнія 1596 г.
16. Міжнародныя сувязі ВКЛ з суседнімі дзяржавамі-княствамі ў XIV-XV ст. ст.
17. Міжнародныя сувязі ВКЛ з суседнімі дзяржавамі ў XVI-XVII ст. ст.
18. Агульназемскія граматы (прывілеі) – асноўныя крыніцы права ў XIV-XV ст. ст.

19. Граматы Казіміра 1447 г. і Аляксандра 1492 г. (характарыстыка і значэнне).

20. Абластныя і валасныя граматы - крыніцы беларускага права.

21. Гарадскія граматы - крыніцы беларускага права.

22. Судзебнік 1468 года – першая спроба кадыфікацыі заканадаўства ў Вялікім княстве Літоўскім.

23. Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года (агульная характарыстыка і значэнне).

24. Статуты Вялікага княства Літоўскага (параўнальная характарыстыка).

25. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года (асноўныя змены і адрозненне ад Статута 1529 года).

26. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г., яго значэнне і месца ў еўрапейскім заканадаўстве.

27. Канстытуцыйнае права Вялікага княства Літоўскага (па граматах).

28. Канстытуцыйнае права Вялікага княства Літоўскага (па Статутах).

29. Асноўныя палажэнні сямейнага права Беларусі XIV-XVII ст.ст.

30. Асноўныя палажэнні грамадзянскага права Беларусі ў XVI-XVII ст. ст.

31. Асноўныя палажэнні працэсуальнага права Беларусі XVI-XVII ст. ст.

32. Судовая рэформа XVI ст. на Беларусі.

33. Асноўныя палажэнні крымінальнага права Беларусі XVI-XVII ст. ст.

34. Галоўны суд Вялікага княства Літоўскага (прававая рэгламентацыя і дзейнасць).

35. Цэнтральныя суды ў Вялікім княстве Літоўскім.

36. Прававая рэгламентацыя і дзейнасць мясцовых судоў для шляхты (на прыкладзе замкавага (гродскага), земскага, падкаморскага або каптуровага суда).

37. Копныя суды на Беларусі.

38. Войтоўска-лаўніцкія суды на Беларусі.

39. Палітычныя і прававыя ідэі на Беларусі ў XVI-XVIII ст. ст.

40. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай.

41. Рэформы ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

42. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 1791 года.

43. Сістэматызацыя права Беларусі ў першай палове XIX ст. Праект зводу мясцовых законаў заходніх губерняў.

44. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў першай палове XIX ст. Мясцовыя ўстановы дзяржаўнага кіравання і суды.

45. Скасаванне прыгонага права на Беларусі. Рэформа мясцовых органаў.

46. Судовая рэформа 1864 года. Асаблівасці яе правядзення на тэрыторыі Беларусі.

47. Земская рэформа 1864 года і асаблівасці яе правядзення на Беларусі.

48. Грамадска-палітычны лад і права на Беларусі на пачатку XX ст.

49. Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі і яе значэнне для Беларусі.

50. Дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый у 1917 годзе.

51. Абластны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронта і яго дзейнасць.

52. Спробы ажыццяўлення ідэі “права нацый на самавызначэнне” у Беларусі ў 1917-1918 г. г.

53. Беларускі з’езд (кангрэс) 1917 г.

54. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі у 1918 годзе. Устаўныя граматы.

55. Першы з’езд Кампартыі Беларусі і яго дзяржаўна-прававое значэнне.

56. Першы ўрад Беларускай ССР і яго Маніфест.

57. Дзяржаўна-прававое значэнне першага з’езда Саветаў Беларускай ССР.

58. Першая Канстытуцыя Беларускай ССР 1919 г.

59. Літоўска-Беларуская ССР: утварэнне, дзейнасць, ліквідацыя.

60. Аднаўленне Беларускай ССР у 1920 годзе і яго значэнне.

61. Дзяржаўна-прававое значэнне другога з’езда Саветаў Беларускай ССР.

62. Дзяржаўна-прававыя адносіны Беларускай ССР з РСФСР да ўтварэння СССР.

63. Беларускія ўрады і іх дзейнасць ў першыя гады існавання БССР.

64. Дагаворныя адносіны паміж БССР і РСФСР у 20-я гады.

65. Утварэнне дзяржаўнага апарата ў БССР у 1921-1922 г. г.

66. Уваход БССР у склад СССР: працэдура і заканадаўчая рэгламентацыя.

67. Палітыка нацыянальнага – дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР у 20-я гады.

68. Вяртанне ў склад Беларускай ССР усходніх раёнаў Беларусі.

69. Крымінальнае права Беларускай ССР у 20-30-я гады.

70. Крымінальна-працэсуальнае права БССР у 20-30-я гады.

71. Грамадзянскае і грамадзянска-працэсуальнае права Беларускай ССР у 20-30-я гады.

72. Судовы лад і судаводства БССР у 20-30-я гады.

73. Канстытуцыя БССР 1927 г.

74. Парушэнні законнасці на Беларусі ў 20-50 г. г. (прычыны і сутнасць)

75. Канстытуцыя Беларускай ССР 1937 г. Змены ў структуры і кампетэнцыя органаў дзяржаўнай улады.

76. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы.

77. Мясцовыя органы кіравання і самакіравання на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг.

78. Утварэнне часовых органаў улады ў Заходняй Беларусі ў 1939 г.

79. Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі і яго дзяржаўна-прававыя акты.

80. Утварэнне органаў Савецкай улады ў заходніх абласцях Беларускай ССР.

81. Беларуская ССР ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

82. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі і адбудова дзяржаўнага апарата Беларускай ССР.

83. Беларуская дзяржава і права ў пасляваенны перыяд (1945-1954 г.г.).

84. Беларуская дзяржава і права ў перыяд пасляваенных рэформ (1954-1964 г.г.).

85. Заканадаўчая рэгламентацыя пашырэння правоў Беларускай ССР пасля ХХ з’езда КПСС.

86. Беларуская дзяржава і права ў 1965-1984 г.г.

87. Канстытуцыя БССР 1978 г.

88. Актывізацыя знешне-палітычнай дзейнасці БССР у 40-я гады.

89. Міжнародная дзейнасць БССР у 50 – 60 г. г.

90. Міжнародная дзейнасць БССР у 70 – 80 г. г.

91. Пераход Беларусі да дзяржаўнай самастойнасці. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

92. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека і Беларусь.

93. Распад СССР і ўтварэнне СНД.

94. Дзяржаўна-прававыя сувязі Рэспублікі Беларусь з Расіяй.

95. Дзяржаўна-прававыя сувязі Рэспублікі Беларусь з краінамі бліжняга замежжа ў 90-я гады.

96. Пашырэнне міжнародных сувязяў Рэспублікі Беларусь у 90-х г.г.

97. Рэарганізацыя органаў улады і кіравання ў Рэспубліцы Беларусь у 90-я гады.

98. Канстытуцыйнае заканадаўства Рэспублікі Беларусь у 90-я гады.

99. Актывізацыя грамадска-палітычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 90-я гады.

100. Развіццё права Рэспублікі Беларусь у 90-я гады (на прыкладзе грамадзянскага, крымінальнага, зямельнага, экалагічнага, крымінальна-працэсуальнага, грамадзянска-працэсуальнага і іншых галін права).

# ТЭМАТЫКА
# СТУДЭНЦКІХ НАВУКОВЫХ ПРАЦ
# па курсу “ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ”

Дзяржавы-княствы на тэрыторыі Беларусі ў IX-XII ст. ст. і іх грамадскі лад (на прыкладзе Полацкага, Віцебскага, Турава-Пінскага і інш.княстваў).

Міжнародныя пагадненні і васальныя дагаворы – крыніцы старажытнага беларускага права.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Вялікага княства Літоўскага ў XIV-XVI ст. ст.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа на Беларусі ў XVI - XVII ст. ст.

Прававое становішча шляхты на Беларусі ў XV-XVII ст. ст.

Прававое і сацыяльнае становішча сялян Беларусі ў XVI ст.

Прававое і сацыяльнае становішча мяшчан Беларусі ў XIV-XVII ст.

Сойм і рада ў Вялікім княстве Літоўскім у XV-XVII ст. ст.

Мясцовыя органы дзяржаўнай улады на Беларусі ў XV-XVII ст. ст.

Органы кіравання ў гарадах Беларусі ў XV-XVII ст. ст. (па магдэбургскаму праву).

Уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай у XIV-XV ст. ст.

Люблінская ўнія 1569 г.

Берасцейская царкоўная ўнія 1596 г.

Міжнародныя сувязі ВКЛ з суседнімі дзяржавамі-княствамі ў XV-XVI ст. ст

Агульназемскія граматы (прывілеі) – асноўныя крыніцы права ў XIV-XV ст. ст.

Абласныя і валасныя граматы - крыніцы беларускага права.

Гарадскія граматы - крыніцы беларускага права.

Судзебнік 1468 года – першая спроба кадыфікацыі заканадаўства ў Вялікім княстве Літоўскім.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года (агульная характарыстыка і значэнне).

Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года (асноўныя змены і адрозненне ад Статута 1529 года).

Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г., яго значэнне і месца ў еўрапейскім заканадаўстве.

Канстытуцыйнае права Вялікага княства Літоўскага.

Асноўныя палажэнні грамадзянскага права Беларусі ў XVI-XVII ст. ст.

Асноўныя палажэнні працэсуальнага права Беларусі ў XV - XVI- ст. ст.

Судовая рэформа XVI ст. на Беларусі.

Асноўныя палажэнні крымінальнага права Беларусі XV-XVI ст. ст.

Цэнтральныя суды ў Вялікім княстве Літоўскім і ўтварэнне Галоўнага суда.

Прававая рэгламентацыя і дзейнасць мясцовых судоў для шляхты (на прыкладзе замкавага (гродскага), земскага, падкаморскага або каптуровага суда).

Копныя суды на Беларусі.

Войтоўска-лаўніцкія суды на Беларусі.

Палітычныя і прававыя ідэі на Беларусі ў XVI-XVIII ст. ст.

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай.

Рэформы ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 1791 года.

Сістэматызацыя права Беларусі ў першай палове XIX ст. Праект зводу мясцовых законаў заходніх губерняў.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў першай палове XIX ст. Мясцовыя ўстановы дзяржаўнага кіравання і суды.

Судовая рэформа 1864 года. Асаблівасці яе правядзення на тэрыторыі Беларусі.

38.Земская рэформа 1864 года і асаблівасці яе правядзення на Беларусі.

Абластны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронта і яго дзейнасць.

Спробы ажыццяўлення ідэі “права нацый на самавызначэнне” у Беларусі ў 1917-1918 г. г.

Беларускі з’езд (кангрэс) 1917 г.

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі у 1918 годзе. Устаўныя граматы.

Першы з’езд Кампартыі Беларусі. Дзяржаўна-прававое значэнне яго пастаноў. Вызначэнне тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі.

Першы ўрад Беларускай ССР і яго Маніфест.

Дзяржаўна-прававое значэнне першага з’езда Саветаў Беларускай ССР.

Першая Канстытуцыя Беларускай ССР 1919 г.

Літоўска-Беларуская ССР: утварэнне, дзейнасць, ліквідацыя.

Аднаўленне Беларускай ССР у 1920 годзе і яго значэнне.
Дзяржаўна-прававое значэнне другога з'езда Саветаў Беларускай ССР.
Дзяржаўна-прававыя адносіны Беларускай ССР з РСФСР да ўтварэння СССР.
Беларускія ўрады і іх дзейнасць ў першыя гады існавання БССР.
Дагаворныя адносіны паміж БССР і РСФСР у 20-я гады.
Палітыка нацыянальнага – дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР у 20-я гады.
Вяртанне ў склад Беларускай ССР усходніх раёнаў Беларусі.
Крымінальнае права Беларускай ССР у 20-30-я гады.
Крымінальна-працэсуальнае права БССР у 20-30-я гады.
Грамадзянскае і грамадзянска-працэсуальнае права Беларускай ССР у 20-30-я гады.
Судовы лад і судаводства БССР у 20-30-я гады.
Канстытуцыя БССР 1927 г.
Парушэнні законнасці на Беларусі ў 20-50 г. г. (прычыны і сутнасць)
Канстытуцыя Беларускай ССР 1937 г. Перамены ў структуры і кампетэнцыя органаў дзяржаўнай улады.
Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы.
Мясцовыя органы кіравання і самакіравання на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг.
Утварэнне часовых органаў улады ў Заходняй Беларусі ў 1939 г.
Утварэнне органаў Савецкай улады ў заходніх абласцях Беларускай ССР.
Нямецкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі БССР у 1941-1944 гг.
Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі і адбудова дзяржаўнага апарата Беларускай ССР.
Беларуская дзяржава і права ў пасляваенны перыяд (1945-1954 г.г.).
Беларуская дзяржава і права ў 1954-1964 г.г.
Заканадаўчая рэгламентацыя пашырэння правоў Беларускай ССР пасля ХХ з'езда КПСС.
Беларуская дзяржава і права ў 1965-1984 г.г.
Актывізацыя знешне-палітычнай дзейнасці БССР у 40-я гады.
Міжнародная дзейнасць БССР у 50 – 60 г. г.
Міжнародная дзейнасць БССР у 70 – 80 г. г.
Пераход Беларусі да дзяржаўнай самастойнасці і развіццё канстытуцыйнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.
Распад СССР і ўтварэнне СНД.
Дзяржаўна-прававыя сувязі Рэспублікі Беларусь з Расіяй.

Дзяржаўна-прававыя сувязі Рэспублікі Беларусь з краінамі бліжняга замежжа ў 90-я гады.

Пашырэнне міжнародных сувязяў Рэспублікі Беларусь у 90-х г.г.

Рэарганізацыя органаў улады і кіраванняў Рэспубліцы Беларусь у 90-я гады.

Актывізацыя грамадска-палітычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 90-я гады.

Развіццё права Рэспублікі Беларусь у 90-я гады (на прыкладзе грамадзянскага, крымінальнага, зямельнага, экалагічнага, крымінальна-працэсуальнага, грамадзянска-працэсуальнага і іншых галін права).

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ЭКЗАМЕНАЎ

Экзамены з’я?ляюцца справаздачай студэнта аб рабоце па асваенню адпаведнага прадмета. Экзаменацыйныя пытанні ставяцца ? межах тэматыкі, вызначанай праграмай курса гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Яны зацвярджаюцца на пасяджэнні кафедры.

Пасля правядзення лекцый і семінарскіх занятка? студэнт самастойна працягвае рыхтавацца да экзамена?. Самастойная праца студэнта? ажыцця?ляецца ? розных формах:

а) азнаямленне з дапа?няльнай літаратурай (манаграфічнай, перыядычнай і інш.);

б) напісанне курсавых прац і напісанне рэферата?;

в) удзел у працы навуковых гуртко?;

г) падрыхто?ка і выступленне з дакладамі на навуковых канферэнцыях;

д) вывучэнне і пара?нальны аналіз прававых крыніц і дакументальнага матэрыялу.

З мэтай максімальнага збліжэння навуковых і вытворчых інтарэсаў ўвесь час удасканальваюцца формы самастойнай працы студэнтаў. Для гэтага перш за ўсе актывізуецца ўзаемадзеянне студэнта з выкладчыкам і выкарыстоўваюцца розныя формы кантроля бягучых і выніковых ведаў: праводзяцца калоквіумы, кантрольныя работы, пішуцца рэфераты па вызначаных тэмах, пераздаюцца прапушчаныя семінарскія заняткі і інш.

Студэнт самастойна сістэматызуе атрыманыя на занятках веды, вывучае рэкамендаваную асно?ную і дапа?няльную літаратуру, робіць неабходныя запісы, супаста?ляе погляды вучоных па праблемных пытаннях, удакладняе ?знікшыя пытанні, а пры неабходнасці запісвае пытанні, на якія не змог знайсці адказу, з мэтай удакладнення іх у выкладчыка на кансультацыі.

Абавязковым пры падрыхто?цы да экзамена з’я?ляецца азнаямленне і вывучэнне важнейшых помніка? права. Па дасавецкаму перыяду асабліва гэта тычыцца грамат (прывілея?) - агульназемскіх, абласных, валасных і гарадскіх, а таксама Статута? Вялікага княства Літо?скага 1529, 1566, 1588 гадо?. Трэба мець на ?вазе, што Статут 1529 г. бы? передрукаваны з перакладам і каментарыямі ? 1960 г., а Статут 1588 года - у 1989 годзе. Шэраг грамат і іншых нарматы?на-прававых акта? змешчаны ў розных хрэстаматыях па гісторыі Беларусі, у чатырохтомным выданні “Беларусь у эпоху феадалізма”

(Т.1-4. Мінск. 1959, 1960, 1961, 1979), у кнізе: Вішне?скі А.Ф., Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ? дакументах і матэрыялах. Мінск, 1998, у кнізе: Васілевіч Г.А., Доўнар Т.І., Юхо І.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі. Мінск, 2001 і інш. Дакументы і нарматы?на-прававыя акты Беларускай ССР змешчаны ў навучальных дапаможніках: Довнар Т. И. Краткий очерк истории государства и права Республики Беларусь (послеоктябрьский период). Минск, 1997, Учебное пособие по истории государства и права Республики Беларусь (авторы - составители И. А. Юхо, Л. К. Сокол). Минск, 1995 і інш. З нарматыўна-прававым матэрыялам Рэспублікі Беларусь 90-х гадоў можна азнаёміцца: Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 1991-1996 г.г.; Збор пастаноў Урада Беларускай ССР (з 1991 Урада Рэспублікі Беларусь) 1990-1998.г.г.; Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь 1994-1996 гг. і інш.

У выніку вывучэння прадмета студэнты павінны:

а) мець глыбокія веды вучэбнага праграмнага матэрыялу;

б) глыбока засвоіць асноўную літаратуру, рэкамендаваную праграмай;

в) разбірацца ў навуковых канцэпцыях адносна гісторыі дзяржавы і права Беларусі,

г) усведамляць прычыны ўзнікнення, станаўлення і развіцця дзяржавы і права на тэрыторыі Беларусі, а таксама тыя фактары і гістарычныя падзеі, якія станоўча ці адмоўна ўплывалі на развіццё;

д) мець належнае ўяўленне аб паэтапным развіцці дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі і асноўных тэндэнцыях у развіцці права і прававых інстытутаў;

е) мець навыкі працы са старажытнымі дакументамі і помнікамі права, а таксама з заканадаўчым матэрыялам савецкага перыяду;

ж) умець аналізаваць і абагульняць матэрыял з мэтай выяўлення заканамернасцей, тендэнцый і перспектыў развіцця дзяржавы і права Беларусі.

## Экзаменацыйныя пытанні па курсу
## “ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ”

Прадмет, яго асаблівасці і задачы. Назвы “Беларусь” і “Літва”.

Гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Праблемы гісторыка-прававой навукі.

Утварэнне дзяржаў у славянскіх народаў Усходняй Еўропы (перыяд, прычыны і працэс утварэння).

Дзяржавы-княствы на тэрыторыі Беларусі ў IX-XII ст. ст. і іх грамадскі лад.

Палітычны лад старажытных дзяржаў. Князь. Веча (сойм). Службовыя асобы.

Асноўныя рысы звычаевага права Беларусі. Адлюстраванне звычаевага права ў пісаным заканадаўстве.

Міжнародныя пагадненні і васальныя дагаворы – крыніцы старажытнага беларускага права.

Утварэнне Вялікага княства Літоўскага. Прычыны. Канцэпцыі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне ў XIV-XVI ст. ст.

Клас феадалаў і саслоўе шляхты на Беларусі ў XV-XVII ст. ст.

Прававое і сацыяльнае становішча сялян Беларусі ў XVI ст.

Прававое і сацыяльнае становішча мяшчан Беларусі ў XIV-XVII ст.

Вялікі князь у Вялікім княстве Літоўскім у XV-XVI ст. ст. і яго прававое становішча. Службовыя асобы цэнтральнай адміністрацыі.

Рада і сойм ў Вялікім княстве Літоўскім. Утварэнне, змены ў складзе і кампетэнцыі.

Мясцовыя органы дзяржаўнай улады на Беларусі ў XV-XVII ст. ст.

Органы кіравання ў гарадах Беларусі ў XV-XVII ст. ст. Магдэбургскае права.

Крэўская і Гарадзельская ўніі (прычыны заключэння, значэнне і наступствы).

Люблінская ўнія (гісторыка-прававая характарыстыка)

Берасцейская царкоўная ўнія (прычыны заключэння і наступствы).

Міжнародныя сувязі ВКЛ з суседнімі дзяржавамі ў XV-XVI ст. ст.

Агульназемскія граматы (прывілеі). Іх значэнне і змест.

Абластныя і валасныя граматы (прывілеі). Іх змест і прызначэнне.

Гарадскія граматы: характарыстыка і значэнне.

Судзебнік 1468 года: паходжанне, крыніцы, структура, змест.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года. Яго находжанне, крыніцы, структура, змест.

Статуты Вялікага княства Літоўскага. Агульная характарыстыка і значэнне.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. Асноўныя змены і адрозненне ад Статута 1529 года.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Яго змест і значэнне.

Канстытуцыйнае права Вялікага княства Літоўскага.

Асноўныя палажэнні грамадзянскага права Беларусі ў XVI-XVII ст. ст.

Асноўныя палажэнні працэсуальнага права Беларусі XVI-XVII ст. ст.

Судовая рэформа XVI ст. на Беларусі.

Асноўныя палажэнні крымінальнага права Беларусі XVI-XVII ст. ст.

Цэнтральныя судовыя ўстановы ў Вялікім княстве Літоўскім. Галоўны суд (Трыбунал).

Замкавыя (гродскія) суды на Беларусі.

Мясцовыя суды для шляхты (склад, кампетэнцыя, значэнне).

Суды для гарадскога насельніцтва ў Вялікім княстве Літоўскім.

Суды для сялян на Беларусі.

Прававая думка на Беларусі ў XVI-XVIII ст. ст.

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Абмежаванасць улады караля. Сойм і яго дзейнасць. Спробы правядзення рэформаў у другой палове XVIII ст. Першы падзел Рэчы Паспалітай і яго вынікі.

Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 1791 года. Таргавіцкая канфедэрацыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

Паўстанне 1794 года. Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Яго прычыны і вынікі.

Сістэматызацыя права Беларусі ў першай палове XIX ст. Праект зводу мясцовых законаў заходніх губерняў.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў пачатку XIX ст. Органы ўлады, мясцовага кіравання і суда.

Скасаванне прыгонага права на Беларусі. Рэформа мясцовых органаў.

Судовая рэформа 1864 года і асаблівасці яе правядзення на Беларусі.

Земская рэформа 1864 года і асаблівасці яе правядзення на Беларусі.

Беларусь на пачатку XX ст. Дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі і яе значэнне для Беларусі..

Усталяванне Савецкай улады на Беларусі ў 1917 г. Абластны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронта. Савет народных камісараў Заходняй вобласці.

Спробы ажыццяўлення ідэі "права нацый на самавызначэнне" на Беларусі. Усебеларускі з'езд (кангрэс) 1917 г.

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі у 1918 годзе. Устаўныя граматы.

Першы з'езд Кампартыі Беларусі. Дзяржаўна-прававое значэнне яго пастаноў. Вызначэнне тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі.

Першы ўрад Беларускай ССР і яго Маніфест.

Першы з'езд Саветаў Беларусі. Дэкларацыі з'езда.

Першая Канстытуцыя Беларускай ССР 1919 г.

Літоўска-Беларуская ССР: утварэнне, дзейнасць, ліквідацыя.

Аднаўленне Беларускай ССР у 1920 годзе. Дэкларацыя аб незалежнасці ССРБ.

Другі з'езд Саветаў Беларускай ССР. Дапаўненні да Канстытуцыі.

Дзяржаўна-прававыя адносіны Беларускай ССР з РСФСР. Дагавор паміж БССР і РСФСР 1921г. Рыжскі мірны дагавор.

Пераход да Новай эканамічнай палітыкі. Утварэнне дзяржаўнага апарата ў БССР у 1921-1922 г. г. Уваход БССР у склад СССР.

Палітыка нацыянальнага – дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР у 20-я гады.

Вяртанне ў склад Беларускай ССР усходніх раенаў Беларусі.

Крымінальнае і крымінальна-працэсуальнае права Беларускай ССР у 20-30-я гады.

Грамадзянскае і грамадзянска-працэсуальнае права Беларускай ССР ў 20-30-я гады.

Судовая сістэма Беларускай ССР у 20-30-я гады.

Канстытуцыя Беларускай ССР 1927 г. Вышэйшыя і мясцовыя органы ўлады.

Парушэнні законнасці на Беларусі ў 20-50 г. г. (прычыны і сутнасць).

Канстытуцыя Беларускай ССР 1937 г. Перамены ў структуры і кампетэнцыя органаў дзяржаўнай улады.

Мясцовыя органы кіравання і самакіравання на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. Бяспраўнае становішча і барацьба працоўных Заходняй Беларусі.

Пачатак другой сусветнай вайны. Разгром Польскай дзяржавы. Утварэнне часовых органаў улады ў Заходняй Беларусі ў 1939 г.

Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі і яго дзяржаўна-прававыя акты.

Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Утварэнне органаў Савецкай улады ў заходніх абласцях Беларускай ССР.

Дзяржава і права ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Нямецкі акупацыйны рэжым на Беларусі.

Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі і адбудова дзяржаўнага апарата Беларускай ССР.

Беларуская дзяржава і права ў пасляваенны перыяд (1945-1954 г.г.).

Беларуская дзяржава і права ў перыяд пасляваенных рэформаў (1954-1964). Перабудова дзяржаўнага апарата. Пашырэнне правоў рэспублікі.

Беларуская дзяржава і права ў перыяд застою і ўмацавання камандна-адміністрацыйнай сістэмы (1965-1984 г.г. ). Кадыфікацыя заканадаўства. Канстытуцыя БССР 1978 г.

Актывізацыя знешне-палітычнай дзейнасці Беларускай ССР пасля 1944 г. Стварэнне ААН.

Міжнародная дзейнасць Беларускай ССР у 50-80-я гады.

Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека і Беларусь.

Распад СССР і ўтварэнне СНД. Дзяржаўныя сувязі Рэспублікі Беларусь з Расіяй і краінамі бліжняга замежжа.

Міжнародная дзейнасць Рэспублікі Беларусь у 90-я гады.

Пераход Беларусі да дзяржаўнай самастойнасці. Рэарганізацыя дзяржаўных органаў.

Змены у канстытуцыйным праве. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. Змяненні і дапаўненні да Канстытуцыі, прынятыя 24.11.1996 г.

Актывізацыя грамадска-палітычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Утварэнне і дзейнасць палітычных партый у 90-я гады.

Развіццё права Рэспублікі Беларусь у 90-я гады.

# П Р А Г Р А М А
## курса «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі»

А?тары:
доктар юрыдычных навук, прафесар Юхо І. А.;
доктар юрыдычных навук, прафесар До?нар Т. І.

## П Р А Д М О В А

Дзяржа?ны лад Рэспублікі Беларусь, заснаваны на шматвяковай гісторыі беларускай дзяржа?насці, развіваецца ? напрамку пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы. Гэтаму спрыяе вучэбная дысцыпліна - гісторыя дзяржавы і права Беларусі, што выкладаецца ? вышэйшых навучальных установах прававога цыкла ? нашай рэспубліцы. Без грунто?нага ведання гістарычных падзей і яснага разумення ?сяго ходу гісторыі немагчыма мець цвёрды светапогляд і ясна бачыць перспектывы будучыні.

Задачамі навучальнай дысцыпліны з'яўляюцца: аналіз гістарычнага ходу падзей у іх храналагічнай паслядо?насці і вызначэнне заканамернасцей гэтага працэсу; вызначэнне асно?ных тэндэнцый у развіцці і дзейнасці органа? улады і кіравання, судовых устано?; вывучэнне прававых крыніц, асобных інстытута? і галін права з мэтай ацэнкі мінулых набытка? і выя?лення заканамернасцей развіцця права; аналіз прававога становішча ?сіх пласто? насельніцтва і інш.

Неабходна мець на ?вазе, што некаторыя гістарычныя пытанні яшчэ застаюцца мала даследаванымі або праблемнымі. Характэрнай асаблівасцю прававой гісторыі Беларусі з'я?ляецца тое, што на працягу стагоддзя? змянялася назва беларускага народа, у сувязі з чым яго гісторыя часам прыпісвалася іншым народам, трактавалася адвольна.

Прымаючы пад увагу неаднастайнасць і своеасаблівасць гістарычных перыяда?, якія прайшла беларуская дзяржа?наць, у праграму ?водзіцца характэрная перыядызацыя гісторыі дзяржавы і права Беларусі з мэтай арыентаваць студэнта? на важнейшыя падзеі гістарычнага развіцця. Матэрыял размешчаны ? храналагічнай паслядо?насці па тэмах, якія адлюстро?ваюць асаблівасці генезісу беларускай дзяржа?насці і права.

## Уводзіны.

Прадмет і задачы навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі.
Асаблівасці. Паходжанні назвы Беларусь.
Гістарыяграфія навукі гісторыі дзяржавы і права.

## Тэма І
## Грамадска-палітычны лад і права на Беларусі ? перыяд усталяваннядзяржа?насці ?сходніх славян

Старажытныя беларускія княствы. Асно?ныя рысы права.

Утварэнне дзяржа? у славянскіх народа? Усходняй Е?ропы. Прычыны. Перыяд узнікнення.

Дзяржавы-княствы на тэрыторыі крывічо?, драгавіта? (драгавічо?), радзіміча?, бужан і інш. Полацкае, Віцебскае, Турава-Пінскае, Берасцейскае, Смаленскае, Гарадзенскае, Менскае і іншыя княствы.

Грамадскі лад. Палітычны лад. Органы кіравання і суда.

Асно?ныя рысы старажытнага права. Крывіцкі дагавор 1229 г. з Рыгай і Гоцкім берагам, іншыя крыніцы права.

## Тэма 2
## Утварэнне і развіццё Вялікага княства Літо?скага. Яго грамадскі і дзяржа?на-палітычны лад

Канцэпцыі ?тварэння Вялікага княства Літо?скага.

Эканамічныя, палітычныя і міжнародныя передумовы ?тварэння Вялікага княства Літо?скага.

Працэс аб’яднання беларускіх княства? у адну феадальную дзяржаву з цэнтрам у Навагародку. Тэрыторыя Вялікага княства Літо?скага. Яго адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у XIV ст. Васальная залежнасць мясцовых князё? ад вялікага князя.

Класы і сасло?і на Беларусі.

Сацыяльнае і прававое становішча сялян: гаспадарскіх, панскіх, царко?ных. Баяры путныя, баяры панцырныя, слугі. Сяляне даннікі, цяглыя, асадныя, агароднікі, халупнікі.

Клас феадала? і сасло?е шляхты.

Служылая шляхта. Убогая шляхта. Паходжанне шляхты. Прававое становішча шляхты. Іх правы і абавязкі.

Мяшчане беларускіх гарадо?. Сацыяльныя групы.

Прававое становішча мяшчан. Абмежаванасць іх право?. Цэхі. Братствы.

Вялікі князь, яго прававое становішча. Віцень. Гедзімін. Я?нуцій. Альгерд. Ягайла. Кейстут. Скіргайла. Віта?т. Свідрыгайла. Жыгімонт. Андрэй Казімір. Аляксандр. Жыгімонт 1 Стары. Жыгімонт II А?густ. Генрых Валуа. Стэфан Баторы. Жыгімонт III Ваза.

Рада Вялікага княства Літо?скага. Яе склад і кампе-тэнцыя. Прававое становішча рады.

Сойм Вялікага княства Літо?скага. Яго склад і парадак дзейнасці. Выключная кампетэнцыя сойма.

Вышэйшыя службовыя асобы Вялікага княства Літо?скага. Маршалак земскі. Канцлер. Гетман земскі. Падскарбі земскі і іншыя. Іх дзейнасць і прававое становішча.

Мясцовыя органы дзяржа?най улады. Працэс цэнтралізацыі дзяржавы. Змены ? адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле. Утварэнне ваяводства? і павета?. Службовыя асобы мясцовай адміністрацыі. Ваяводы. Старасты. Дзяржа?цы. Павятовыя маршалкі. Харужыя. Старцы. Соцкія і іншыя.

Органы кіравання ? гарадах. Войты. Бурмістры. Радцы. Ла?нікі.

Міжнародныя сувязі Вялікага княства Літо?скага з Лівоніяй, з Маско?скай, Цверскай, Пско?скай, На?гародскай і іншымі дзяржавамі.

Васальная залежнасць княства? Адае?скага, Навасільскага, Казельскага ад Вялікага княства Літо?скага.

Уніі з Польшчай: Крэ?ская. Гарадзельская. Уніі пры Казіміры, Аляксандры, Жыгімонце Старым.

Далучэнне Лівоніі да Вялікага княства Літо?скага.

Люблінская унія 1569 г. Брэсцкая царко?ная унія 1596 г.

## Тэма 3
## Судовая сістэма Вялікага княства Літо?скага. Судаводства

Гаспадарскі (велікакняжацкі) суд, яго склад, парадак дзейнасці. Падсуднасць спра?. Іншыя вышэйшыя суды.

Судовая рэформа ? XVI ст.

Гало?ны суд (Гало?ны трыбунал), парадак яго фарміравання і дзейнасці.

Мясцовыя суды: замкавы або гродскі, земскі, падкаморскі, каптуровы, копны, вайто?ска-ла?нічы. Парадак іх фарміравання і дзейнасці.

Вотчынны суд феадала над залежнымі людзьмі.

Асно?ныя палажэнні працэсуальнага права. Судаводства, судовыя акты.

## Тэма 4
## Феадальнае права Беларусі

Крыніцы права. Звычаёвае права. Агульназемскія прывілеі: Ягайлы, Гарадзельскія, Казіміра, Аляксандра.

Абласныя прывілеі (граматы). Віцебскія 1503, 1509, 1561; Полацкія 1511, 1547, 1580; Смаленскі 1505; Бельскі 1501, 1547; Драгічынскія 1511, 1547; Мсціслa?скі 1551.

Валасныя прывілеі (граматы).

Гарадскія прывілеі на Магдэбургскае права.

Судзебнік Казіміра.

Статут 1529 г.

Статут 1566 г.

Статут 1588 г.

Устава на валокі 1557 г.

Ваенныя ?ставы.

Асно?ныя палажэнні галіновага права: канстытуцыйнага, грамадзянскага, адміністрацыйнага, вайсковага, зямельнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і інш.

Палітычныя, прававыя і царко?на-рэфармацыйныя ідэі на Беларусі ? XVI - XVII ст.

Юрыдычная адукацыя ? Вялікім княстве Літо?скім. Развіццё палітыка-прававых ідэй. Прагрэсі?ныя ідэі дробнай шляхты і гараджан. Ф.Скарына. М.Гусо?скі, М.Літвін С.Будны. А.Волан. В.Цяпінскі.

Феадальная ідэалогія. М.Радзівіл. А.Валовіч. Л.Сапега.

Царко?ная ідэалогія (правасла?ная, каталіцкая, пратэстанцкая).

## Тэма 5
## Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ? складзе канфедэраты?най Рэчы Паспалітай (XVII - XVIII стст.)

Рэч Паспалітая ? XVII - XVIII ст.

Дзяржа?на-прававое становішча Вялікага княства Літо?скага ? складзе Рэчы Паспалітай. Вышэйшыя органы дзяржа?най улады Рэчы Паспалітай. Кароль і яго па?намоцтвы. Сойм Рэчы Паспалітай. Яго склад і парадак дзейнасці. Сенат Рэчы Паспалітай. Соймавыя пастановы.

Павятовыя сеймікі.

Спробы правядзення рэформ дзяржа?нага ладу Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVIIIст. Слуцкая і Барская канфедэрацыі. Першы падзел Рэчы Паспалітай. Пастаянная Рада. Чатырохгадовы сойм Рэчы Паспалітай. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 1791 г. Змены ? дзяржа?ным ладзе і ? структуры вышэйшых органа? улады.

Таргавіцкая канфедэрацыя і замежная інтэрвенцыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Гродзенскі сойм і яго канстытуцыя. Па?станне 1794 г. пад кіра?ніцтвам А.Т. Касцюшкі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі.

Крыніцы права. Валюміна легум. Новыя выданні Статута 1588 г.

Развіццё гарадскога права.

Палітычныя і прававыя ідэі ? XVII - XVIII ст.

Т.Астро?скі, А.Алізаро?скі, А.Т.Касцюшка, І.Капіевіч, Г.Калантай, К.Нарбут, А.Нарушэвіч, І.Страйно?скі, І.Храптовіч і інш.

Юрыдычная адукацыя. Юрыдычны факультэт Віленскай акадэміі.

## Тэма 6
## Грамадска - палітычны лад і права на Беларусі ? складзе Расійскай імперыі

Грамадска-палітычны лад.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ? першай палавіне XIX ст. Далучэнне Беластоцкай акругі да Расійскай імперыі ? 1807 г. Праект адна?лення Вялікага княства Літо?скага 1811 г.

Органы мясцовага кіравання на тэрыторыі Беларусі: генерал-губернатар, яго па?намоцтвы. Губернатар і губернскае пра?ленне. Казённая палата і іншыя губернскія ?становы.

Губернскія і павятовыя дваранскія (шляхецкія) сходы як органы сасло?нага самакіравання.

Павятовыя органы дзяржа?нага кіравання, паліцэйскі нагляд.

Судовыя ?становы ? губернях і паветах.

Полацкі царко?ны сабор і ліквідацыя уніяцкай царквы на Беларусі.

Палітычныя і прававыя ідэі. Філаматы і філарэты.

Я.Чачот, І.Даніловіч, Ярашэвіч, І.Лялевель, А.Міцкевіч, Я.Баршчэ?скі, Т.Нарбут, В.Дунін-Марцінкевіч.

Права. Кадыфікацыя мясцовага права. Праект зводу закона? Заходніх губерня?. Увядзенне ? дзеянне закона? Расійскай імперыі. Скасаванне Статута 1588 г.

Сацыяльна-эканамічная сітуацыя на Беларусі ? сярэдзіне XIX ст. Скасаванне прыгоннага права. Маніфест ад 19 лютага 1861 г. Агульнае Палажэнне аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці. Палажэнне аб губернскіх і павятовых установах па сялянскіх справах. Мясцовыя палажэнні. Асаблівасці сялянскай рэформы на Беларусі. Прававое становішча сялян пасля рэформы.

Рэформа мясцовых органа?. Міравыя пасрэднікі. Сялянскія сходы. Валаснoе пра?ленне. Валасны суд.

Земская рэформа на Беларусі. Земскія сходы і іх управы.

Судовая рэформа 1864 г. на Беларусі. Міравыя суды. Агульныя суды: акруговыя суды, судовыя палаты. Сенат.

Рэарганізацыя гарадскіх органа? кіравання ? 1870 і 1892 гг. Ваенная рэформа.

Развіцце Палітыка-прававых ідэй. К. Каліно?скі, Ф. Багушэвіч, У. Спасовіч, І. Петражыцкі.

Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух на Беларусі ў пачатку XX ст. Царскі Маніфест ад жніўня 1905г. аб утварэнні дзяржа?най Думы. Іншыя законы. Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. “Аб удасканаленні дзяржа?нага парадку”. Канстытуцыйны характар “Звода асно?ных дзяржа?ных закона?” (красавік 1906 г.). Дзяржа?ны савет і яго дзейнасць.

Сталыпінская аграрная рэформа.

Дзейнасць земства? на Беларусі

Беларусь падчас першай сусветнай вайны.

Права. Змены ? цывільным, крымінальным і працэсуальным праве. Крымінальнае ўлажэнне 1903 г.

Палітычныя і прававыя ідэі. Я. Колас, Я. Купала, Іван  і Антон Луцкевічы, В. Ласто?скі.

## Тэма 7
## Грамадска-палітычны лад і права ? перыяд рэвалюцыйных перамен і змагання за адраджэнне беларускай нацыянальнай дзяржа?насці (1917 – 1920 гг.)

Люта?ская рэвалюцыя ? Расіі і на Беларусі. З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25 - 27 сакавіка 1917 г. і яго рашэнні. Трое?ладдзе на Беларусі.

Усталяванне Савецкай улады на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Абласны выкана?чы камітэт Заходняй вобласці і фронта, яго Прэзідыум і Савет Народных Камісара?.

Усебеларускі з’езд (кангрэс) у Мінску ? снежні 1917 г. Рада Усебеларускага з’езда і яе выкана?чы камітэт. Народны Сакратарыят Беларусі.

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Уста?ныя граматы. Першы ?рад Беларускай Народнай Рэспублікі, яго дзейнасць.

Брэсцкі мірны дагавор.

Уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Беларусі і эвакуацыя ?рада Беларускай Народнай Рэспублікі.

Першы з’езд Кампартыі Беларусі ? Смаленску і яго рашэнні. Фарміраванне ? Маскве ?рада для Беларусі. Склад урада і яго кампетэнцыя.

Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ?раду Беларусі аб утварэнні Беларускай ССР. Тэрыторыя рэспублікі, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.

Першы з’езд Савета? Беларусі і яго рашэнні. Дэкларацыі з'езда.

Першая Канстытуцыя БССР 1919 г.

Утварэнне Літо?ска-Беларускай рэспублікі.

Адна?ленне Беларускай ССР. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнай Беларускай ССР 1920 г.

Ваенна-рэвалюцыйны камітэт БССР.

Другі з’езд Савета? БССР. Дапа?ненні да Канстытуцыі БССР.

Рыжскі мірны дагавор Расіі з Польшчай аб падзеле Беларусі.

## Тэма 8
## Дзяржава і права Беларускай ССР у перыяд новай эканамічнай палітыкі (1921 - 1929 гг.)

Вышэйшыя і мясцовыя органы дзяржа?най улады. Агульны стан эканомікі і культуры ? БССР.

